Праваабарончы цэнтр «Вясна»

# Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў 2024 годзе

## Аналітычны агляд

spring96.org

**Коратка:**

- Аўтарытэтнымі міжнароднымі арганізацыямі выяўленыя грубыя парушэнні правоў чалавека і злачынствы супраць чалавецтва, здзейсненыя ўладамі Беларусі.
- Праваабарончаму цэнтру «Вясна» на канец 2024 года вядома пра 6 550 асуджаных да розных відаў пакарання паводле палітычна матываваных абвінавачанняў, 1 380 з іх — жанчыны. У мінулым годзе былі асуджаныя 1 721 чалавек, з іх 480 жанчын.
- На канец снежня 2024 года ў Беларусі ў месцах зняволення знаходзіліся 1 265 палітвязняволеныя, з іх 168 — жанчыны. З лета 2020 года праваабарончай супольнасцю прызнаныя палітвязнямі 3697 чалавек, з іх 680 жанчын.
- У калоніі ўтрымліваецца лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру Алесь Бяляцкі.
- Па даных «Вясны», летась з рознымі відамі рэпрэсій, звязанымі з крымінальным ці адміністрацыйным пераследам (арыштамі, допытамі, ператрусамі) сутыкнуліся не менш за 8 895 чалавек. Чвэрць рэпрэсаваных — жанчыны. Судамі вынесена не менш за 5 890 адміністрацыйных пастаноў.
- Палітычных зняволеных утрымліваюць у асабліва жорсткіх умовах, пад асабліва строгім кантролем, на іх накладаюцца не прадугледжаныя законам абмежаванні; у выніку многія палітвязні ў дысцыплінарным парадку пазбаўлены належных па законе пасылак, перадач, у тым ліку з лекамі, спатканняў з роднымі, мужам ці жонкай, а таксама адвакатамі; перапіска палітвязняў адвольна абмежавана. Больш за 10 палітвязняў утрымліваюць у рэжыме інкамунікада. Чацвёра палітвязняў памерлі ў калоніях і СІЗА.
- Палітвязні падвяргаюцца прымусовай малааплатнай працы; пасля вызвалення па адбыцці пакарання, палітвязні трапляюць пад строгі кантроль, які выходзіць за межы звычайнага нагляду за вызваленымі асуджанымі; правы асуджаных дадаткова абмяжоўваюцца наступствамі ўключэння ў пералік асобаў, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці.
- Суды працягваюць функцыянаваць у якасці інструмента рэпрэсій у дачыненні да фігурантаў палітычна матываваных адміністрацыйных, крымінальных і грамадзянскіх спраў.
- Колькасць НДА ў Беларусі скарачаецца, дзейнасць многіх асацыяцый адвольна крыміналізуецца ўладамі.
- Працягваецца пераслед за мірнае выказванне меркаванняў, а таксама пад выглядам барацьбы з тэрарызмам і экстрэмізмам і абароны інтарэсаў нацыянальнай бяспекі.
- Узмацніліся рэпрэсіі ў дачыненні да журналістаў, супрацоўнікаў СМІ і блогераў.
- Улады Беларусі па-ранейшаму здзяйсняюць катаванні і ўжываюць забароненае абыходжанне ў дачыненні да іншадумцаў і прадстаўнікоў апазіцыі; няма выпадкаў расследавання і прыцягнення да адказнасці на нацыянальным узроўні асобаў, вінаватых у шырокамаштабных катаваннях і іншых найгрубейшых парушэннях правоў чалавека ў жніўні 2020 года і ў наступныя гады.

- Дыскрымінацыя ў розных сферах захоўваецца, дзяржава не робіць захадаў па яе недапушчэнні.
- Кампанія «Праваабаронцы за свабодныя выбары» прадставіла экспертную ацэнку выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і мясцовыя Саветы дэпутатаў, а таксама ажыццяўляе назіранне за выбарамі прэзідэнта, прызначанымі на 26 студзеня 2025 года.

**Уводзіны**

Праваабарончы цэнтр «Вясна» штогод падводзіць вынікі і ацэньвае сітуацыю ў Беларусі з пункту гледжання выканання правоў чалавека. Агляд сітуацыі з правамі чалавека заснаваны на ўласнай інфармацыі «Вясны», атрыманай з розных крыніц, якія заслугоўваюць даверу, уключае даныя з адкрытых крыніц і ўлічвае звесткі іншых міжнародных і праваабарончых арганізацый і ініцыятыў.

Пачатак і канец 2024 года прайшлі ў абстаноўцы павышанага ўзроўню рэпрэсій. Гэта было абумоўлена ў тым ліку аб'яўленымі ўладамі Беларусі фіктыўнымі выбарамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, мясцовых Саветаў дэпутатаў, удзельнікаў Усебеларускага народнага сходу, якія прайшлі на пачатку года, і выбарамі прэзідэнта, якія стартавалі ў кастрычніку.

Пераслед іншадумцаў, удзельнікаў пратэстаў 2020 года, апазіцыйных актывістаў у Беларусі і за мяжой стаў рэгулярным працэсам. Істотнае скарачэнне гарантыяў у галіне грамадзянскіх і палітычных правоў для грамадзянаў Беларусі, штодзённасць грубых парушэнняў базавых правоў і свабодаў, нават тых, якія маюць абсалютны характар, адсутнасць праваабарончых механізмаў – вынік і інструмент неканстытуцыйнага ўтрымання ўлады рэжымам А. Лукашэнкі пасля прайграных выбараў у 2020 годзе. Штодзённасць катаванняў і іншых відаў забароненага абыходжання, парушэнняў асабістай свабоды і недатыкальнасці, адсутнасць даступных незалежных крыніц інфармацыі і магчымасцяў рэалізаваць палітычныя правы – вынік сістэмных намаганняў уладаў па стварэнні цалкам лаяльнага асяроддзя.

15 сакавіка 2024 года быў апублікаваны Даклад Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека «Становішча з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх»:

*«Ацэньваючы сукупнасць усіх доказаў, сабраных за тры гады <…>, ва Упраўленні Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека (УВКПЧ) ёсць разумныя падставы зрабіць выснову аб тым, што ўрад правёў арганізаваную, бесперапынную і сістэматычную кампанію гвалту, рэпрэсій і пакаранняў у адпаведнасці або для прасоўвання палітыкі нападу на грамадзянскае насельніцтва, канкрэтна ахарактарызаванае і пазначанае як рэальная ці меркаваная апазіцыя, з мэтай прымусіць замаўчаць, здушыць, перашкодзіць і стрымаць такую апазіцыю ці далейшыя яе праявы, як у публічнай прасторы, так і ў прыватным парадку <…> Ва УВКПЧ ёсць разумныя падставы меркаваць, што было здзейснена злачынства супраць чалавечнасьці ў форме*

*перasледу разам з іншымі спадарожнымі дзеяннямі, якія могуць быць устаноўленыя як следства апісаных парушэнняў правоў чалавека*».

Рэзалюцыяй A/HRC/RES/55/27 ад 4 красавіка 2024 года Савет па правах чалавека стварыў на аднаўляльны перыяд у адзін год групу з трох незалежных экспертаў па становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі. СПЧ даручыў групе экспертаў у прыватнасці: займацца зборам, абагульненнем, забеспячэннем захаванасці і аналізам доказаў такіх парушэнняў і ўшчамленняў і, па магчымасці, выяўляць вінаватых з мэтай правядзення адпаведных судовых і іншых разбораў, уключаючы крымінальны пераслед у судах і трыбуналах, якія валодаюць адпаведнай юрысдыкцыяй; выносіць рэкамендацыі, у прыватнасці адносна мер па прыцягненню да адказнасці з тым, каб пакласці канец беспакаранасці і ліквідаваць яе карэнныя прычыны, а таксама забяспечыць прыцягненне да адказнасці вінаватых і доступ ахвяр да правасуддзя і эфектыўных сродкаў прававой абароны, уключаючы кампенсацыю ўрону.

У Дакладзе Спецыяльнай дакладчыцы па пытанні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі **Анаіс Марэн** «Становішча ў галіне права чалавека ў Беларусі» быў прадстаўлены агляд асноўных праблем, якія выклікаюць у яе заклапочанасць у сувязі з правамі чалавека ў Беларусі. Асаблівую ўвагу Спецдакладчыца надае праву на свабоду асацыяцый і паказвае на мэтанакіраванае выкараненне ўсіх незалежных асацыяцый у Беларусі з 2021 года, што закранае арганізацыі ды ініцыятывы грамадзянскай супольнасці, палітычныя партыі, прафсаюзы, калегіі адвакатаў ды рэлігійныя арганізацыі.

У сваім апошнім дакладзе Генеральнай Асамблеі ААН Анаіс Марэн паказала, як Беларусь упарта не выконвае рэкамендацыі праваабарончых органаў і механізмаў ААН, у прыватнасці па стварэнні нацыянальнага інстытута па правах чалавека; адмене смяротнага пакарання; забеспячэнню падзелу галін улады і гарантыі справядлівага судовага разбіральніцтва; спынення адвольных затрыманняў, катаванняў і гендэрнага гвалту; гарантыі грамадзянам правоў на свабоду слова, мірных сходаў, аб'яднанняў і на ўдзел у вядзенні дзяржаўных спраў; а таксама па забеспячэнні адказнасці за сур'ёзныя парушэнні правоў чалавека.

З 1 лістапада 2024 года пост Спецыяльнага дакладчыка заняў **Нілс Муйжніекс**.

Камітэт супраць катаванняў ААН апублікаваў штогадовы даклад, у якім паведаміў аб выніках працы па расследаванні ў дачыненні да Беларусі, якое было ініцыяванае Праваабарончым цэнтрам «Вясна». Расследаванне было запушчана пасля таго, як 4 верасня 2020 года Праваабарончы цэнтр «Вясна» і Беларускі Хельсінкскі камітэт прадставілі ў Камітэт дакумент «Зварот аб правядзенні расследавання па факце сістэматычнага прымянення катаванняў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь». У ім паведамлялася, што на тэрыторыі Беларусі сістэматычна прымяняюцца катаванні і апісваліся рэпрэсіі ў Беларусі пасля выбараў 2020 года. На думку Камітэта, катаванні з'яўляюцца сістэматычнай практыкай у Беларусі.

30 верасня Літва передала сітуацыю ў Беларусі пракурору Міжнароднага крымінальнага суда для расследавання злачынстваў супраць чалавечнасці, здзейсненых аўтарытарным рэжымам Лукашэнкі: на думку ўрада Літоўскай Рэспублікі, ёсць разумныя падставы меркаваць, што з 1 мая 2020 года ў дачыненні да грамадзянскага насельніцтва Беларусі здзяйсняюцца злачынствы супраць чалавечнасці, уключаючы дэпартацыю, пераслед і іншыя бесчалавечныя акты, па ўказанні вышэйшых службовых асоб беларускіх палітычных, праваахоўных і ваенных органаў, і што частка элементаў гэтых злачынстваў была ўчынена на тэрыторыі Літвы, што робіць такія злачынствы часова, тэрытарыяльна і матэрыяльна (па прадмеце) падпадаючымі пад юрысдыкцыю Суда .

На канферэнцыі АБСЕ па чалавечым вымярэнні ў кастрычніку 2024 года ўкраінскія і беларускія праваабаронцы прэзентавалі сумесны даклад *«Скрадзенае дзяцінства: як беларускі рэжым сціраe ўкраінскую ідэнтычнасць у дзяцей праз перамяшчэнне, перавыхаванне і мілітарызацыю»*. Ён падрыхтаваны сумесна Freedom House, Праваабарончым цэнтрам ZMINA, Рэгіянальным цэнтрам па правах чалавека і Праваабарончым цэнтрам «Вясна» пры дапамозе BELPOL. У сярэдзіне верасня аўтары дакладу перадалі дакументы ў Міжнародны крымінальны суд (МУС) у Гаазе і заклікаюць урады краін-членаў Рымскага статута таксама звярнуцца ў суд і перадаць доказы ўдзелу ўладаў Расіі і Беларусі ў перамяшчэнні дзяцей з Украіны.

**Адміністрацыйны і крымінальны пераслед па палітычных матывах**

Крымінальны і параўнальны з ім па цяжкасці санкцый адміністрацыйны пераслед за праявы іншадумства і пратэсты па-ранейшаму застаюцца найбольш жорсткімі формамі палітычна матываваных рэпрэсій у Беларусі. Узровень пераследу ацэньваецца праваабаронцамі на падставе сабраных з розных крыніц звестак, якія ў рознай ступені няпоўныя пры адсутнасці афіцыйнай дэзагрэгаванай інфармацыі. Варта адзначыць, што ўлады робяць намаганні для таго, каб збор аб'ектыўнай інфармацыі быў абцяжараны або немагчымы, забараняючы дзейнасць назіральнікаў і абмяжоўваючы доступ да электронных дзяржаўных рэсурсаў. Таму праваабаронцам складана даць адназначную ацэнку колькасным паказчыкам, якія характарызуюць крымінальны і адміністрацыйны пераслед. Адназначна варта прызнаць, што гэты пераслед застаецца сістэмным, шырока распаўсюджаным: затрыманні і асуджэнні па крымінальных і адміністрацыйных справах рэгулярна адбываюцца практычна ва ўсіх адміністрацыйных раёнах Беларусі, закранаючы як жыхароў гарадоў, так і невялікіх населеных пунктаў. Таксама разнастайны сацыяльны, прафесійны і ўзроставы склад тых, хто патрапіў пад пераслед.

Вядомыя праваабаронцам колькасныя паказчыкі ў 2024 годзе выраслі ў параўнанні з папярэднімі гадамі (за выключэннем вядомай колькасці адміністрацыйных спраў, разгледжаных у пратэстным 2020 годзе).




Разыходжанне вядомых выпадкаў адміністрацыйнага асуджэння з фактычным істотна: напрыклад, паводле афіцыйных звестак у Гродзенскай вобласці (меншай з усіх па насельніцтве ў Беларусі, 992,5 тысяч чалавек) за першыя паўгода 2024 года паводле арт. 19.11 і арт. 24.23 КаАП было прыцягнута да адказнасці не менш за 937 чалавек за «парушэнне парадку правядзення масавых мерапрыемстваў» і «распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў». Да снежня 2024 года гэтая колькасць, па паведамленні ўладаў, павялічылася да 1 693 грамадзян. Праваабаронцам «Вясны» вядома пра 1 363 выпадкі адміністрацыйных асуджэнняў у гэтым рэгіёне за год.

Да канца 2023 года захоўвалася магчымасць супаставіць дадзеныя праваабаронцаў і ўладаў па разгледжаных судамі крымінальных справах. Вынікі параўнанняў даюць падставы меркаваць, што колькасць асуджаных па крымінальных справах перавышае вядомыя праваабаронцам колькасць у 6 550 чалавек і выходзіць за межы 7 000.

У адпаведнасці з прынятым рэпрэсіўным заканадаўствам усе асуджаныя па «экстрэмісцкіх» складах злачынстваў павінны быць унесены ў адпаведны пералік, аднак з невядомай прычыны пастаўленай мэты за мінулы час улады не дасягнулі. Таму спіс з 4 808 асуджаных-»экстрэмістаў» не ў поўнай меры адлюстроўвае маштабы рэпрэсій.




Такім чынам, у сярэднім судамі ў Беларусі выносілася не менш за 143 палітычна матываваныя прысуды па крымінальных справах у месяц (ці амаль сем у кожны працоўны дзень).

Пазбаўленне волі з'яўляецца распаўсюджаным відам пакарання па крымінальных справах. Дакладна вядома аб пазбаўленні волі ў папраўчых установах усіх відаў не менш за 500 чалавек.

Больш за 1 000 абвінавачаных былі асуджаныя за ўдзел у мірных пратэстах, каля 800 абвінавачванняў прад'яўлена за розныя формы выказвання меркаванняў, больш за 300 абвінавачванняў прад'яўлена за розныя формы ўдзелу ў дзейнасці, падтрымку і фінансаванне суб'ектаў, адвольна прызнаных уладамі «экстрэмісцкімі» і «тэрарыстычнымі» (многім адначасова прад'яўлялі некалькі абвінавачванняў).




Гэтыя тэндэнцыі азначаюць мацнеючы курс рэжыму А. Лукашэнкі на ўзмацненне рэпрэсій, стаўку на тэрор і запалохванне грамадзян, адмаўленне ідэі нацыянальнага прымірэння і дээскалацыі канфлікту паміж уладай і грамадствам. Любыя спекуляцыі ўладаў на тэме нацыянальнага прымірэння і згоды істотна супярэчаць фактычным даным аб маштабах нападаў, якія здзяйсняюцца і плануюцца на грамадзянскае насельніцтва. Нараўне з тэзісамі аб спадзе пратэснай актыўнасці, якія транслююцца прадстаўнікамі ўладаў, праваабаронцы назіраюць паступальны рост колькасці ўзбуджаных крымінальных спраў «экстрэмісцкай накіраванасці» на прыблізна 5 000 у год. Дасягнутая колькасць у 22 500 крымінальных спраў на лістапад 2024 года нават з улікам пэўнай долі спраў, у якіх невядомыя падазроныя або тыя, зто паспеў пакінуць тэрыторыю Беларусі, уяўляе сабой крыніцу далейшага працягу рэпрэсій на будучы перыяд часу.




Найбольш рэпрэсіўнымі рэгіёнамі з'яўляюцца Мінск, Брэсцкая, Гомельская і Гродзенская вобласці.

Між тым улады Беларусі ўсё шырэй практыкуюць трансгранічны пераслед апанентаў рэжыму і нязгодных: набірае абароты прымяненне інстытута спецыяльнай вытворчасці, калі расследаванне сфабрыкаванай крымінальнай справы можа быць завершана без удзелу абвінавачанага, які знаходзіцца за межамі Беларусі, а справа ў судзе разглядаецца завочна з істотнымі парушэннямі права на справядлівы суд. З пачатку прымянення гэтага інструмента адвольных рэпрэсій у верасні 2022 года распачата спецыяльная вытворчасць у дачыненні да 144 чалавек, з іх у дачыненні да 107 (106 па палітычных матывах) чалавек – у 2024 годзе. Той факт, што інстытут спецыяльнай вытворчасці прызначаны для палітычнага пераследу пацвярджаецца колькасцю палітычна матываваных спраў – 141 з 144. Таксама расследаванне шэрагу палітычна матываваных спраў у дачыненні да тых, хто вымушана пакінуў Беларусь, вядзецца без фармальнага пачатку спецыяльнай вытворчасці, у тым ліку ў дачыненні да вялікіх груп фігурантаў: справа Каардынацыйнай рады, узбуджаная Следчым камітэтам супраць 257 чалавек; справа «Беларусаў замежжа» ў дачыненні да не менш за 104 прадстаўнікоў дыяспар, якія ўдзельнічалі за межамі Беларусі ў мерапрыемствах Дня Волі ў 2024 годзе; справа ініцыятывы «Платформа 2025» і «Дзень годнасці 2024» у дачыненні да не менш як 45 чалавек.

Палітычныя крымінальныя рэпрэсіі знаходзяць новыя мэты і **абрушваюцца** на новыя катэгорыі нязгодных.

У 2024 годзе новай мэтай для адвольнага пераследу сталі атрымальнікі гуманітарнай падтрымкі – палітвязні і іх сем'і. У канцы студзеня быў разгорнуты пераслед за дапамогу сем'ям палітвязняў ад ініцыятывы «INeedHelpBY», якую ўлады прызналі «экстрэмісцкім фармаваннем» (*Гл. Пераслед за праяву салідарнасці і дапамогі*). Легальная, не забароненая законам дапамога тым, хто мае патрэбу, стала падставай для

буйных штрафаў і спагнання кошту гэтай дапамогі. Праваабаронцы выступілі з асуджэннем рэпрэсіўнай практыкі ўладаў і заклікамі да захавання падтрымкі і ўзаемадапамогі з захаваннем усіх даступных мер засцярогі. У сярэдзіне лістапада аб новай хвалі затрыманняў родных палітвязняў паведамілі ў ініцыятывах Dissidentby і «Краіна для жыцця».

Нярэдкімі сталі выпадкі пераследу перакананых прыхільнікаў недэмакратычных каштоўнасцяў рэжымаў А. Лукашэнкі і У. Пуціна за несанкцыянаваную актыўнасць альбо неасцярожныя выказванні. Арышты прарасійскай актывісткі **Эльвіры Мірсалімавай**, правакатара **Яўгена Катлярова**, іншых фігур, якія раней дэманстравалі падтрымку рэжыму, падкрэсліваюць манаполію рэжыму на вызначэнне вектара грамадска-палітычнага развіцця дзяржавы і татальны характар кантролю за прыватным жыццём беларусаў.

**Становішча палітвязняў**

На 31 снежня 2024 года, паводле інфармацыі праваабаронцаў[1], у Беларусі ў няволі знаходзіліся 1 265 палітычных зняволеных[2], з іх 168 — жанчыны. Па-ранейшаму ўлады працягваюць утрымліваць у калоніі лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру **Алеся Бяляцкага**.

Колькасць былых[3] палітвязняў з 2020 года дасягнула 2 488 чалавек. З іх постфактум[4] былі прызнаныя палітычнымі зняволенымі 431 чалавек.

---

[1] Дадзеныя могуць быць няпоўнымі ў сувязі з адсутнасцю публічнай дзяржаўнай інфармацыі аб крымінальным пераследзе.
[2] Паводле сумесных заяваў беларускай праваабарончай супольнасці на падставе Кіраўніцтва па вызначэнні паняцця «палітычны зняволены».
[3] Маюцца на ўвазе палітвязні, якія на канец 2024 года ўжо былі вызваленыя з месцаў пазбаўлення волі ў сувязі з адбыццём пакарання, зменай меры стрымання, прызначэннем пакарання, не звязанага з пазбаўленнем волі; амністыяй і памілаваннем, а таксама памерлыя ў зняволенні.
[4] Гэтыя асобы на момант знаходжання ў няволі адпавядалі крытэрам прызнання палітвязнямі, аднак інфармацыя аб іх пазбаўленні волі стала вядома ўжо пасля іх вызвалення. Глядзіце https://spring96.org/be/news/112791




На працягу 2024 года праваабаронцы прызналі палітвязнямі 536 чалавек, у сярэднім — каля 44 чалавек у месяц. Постфактум на працягу года былі прызнаныя палітычнымі вязнямі 219 чалавек.

Адной з ключавых падзей 2024 года стала датэрміновае вызваленне ў парадку памілавання за апошнія паўгода 217 палітвязняў і яшчэ пяць палітвязняў — украінскіх грамадзян — у парадку абмену. Гэта першы маштабны працэс такога кшталту: да ліпеня 2024 года мелі месца выпадкі памілавання 13 чалавек у верасні 2021 года і яшчэ некалькі адзінкавых выпадкаў вызвалення палітвязняў па рашэнні А. Лукашэнкі.

Ацэньваючы гэты працэс, варта мець на ўвазе, што іншых рэалістычных механізмаў датэрміновага вызвалення палітвязняў у створанай рэжымам абстаноўцы не існуе: палітвязні цалкам адбываюць прызначаны судом тэрмін, не атрымліваючы доступ да якіх-небудзь магчымасцяў умоўна-датэрміновага вызвалення па законе ці па амністыі (амністыі 2022 і 2024 года не распаўсюджваліся на палітвязняў), а шмат каму гэты тэрмін адвольна падаўжаецца. Палітычная сітуацыя ў Беларусі таксама не дае спадзяванняў на магчымасць уплыву грамадскасці на гэты працэс. Таму выхад на волю больш за дзве сотні палітвязняў, многія з якіх мелі інваліднасць, цяжкія захворванні, складаную сямейную сітуацыю — гэта безумоўна важная падзея. «Вясна» падтрымлівае ўсе магчымыя намаганні ў гэтым напрамку і зноў падкрэслівае, што на ўладах Беларусі ляжыць адказнасць за жыццё і здароўе ўсіх палітвязняў.

У 2024 годзе стала вядома пра чатыры смерці палітвязняў у месцах пазбаўлення волі, агульная колькасць памерлых палітвязняў у месцах пазбаўлення волі — сем чалавек.

У ноч з 8 на 9 студзеня 2024 года ў папраўчай калоніі № 3 ва ўзросце 50 гадоў памёр Вадзім Храсько, які меў цяжкае захворванне і перанёс у турме пнеўманію. З калоніі ён быў дастаўлены ў шпіталь у крытычным стане, калі выратаваць яго ўжо было немагчыма.

20 лютага 2024 года памёр Ігар Леднік, які меў II групу інваліднасці з прычыны захворвання сардэчна-сасудзістай сістэмы. Ён утрымліваўся ў папраўчай калоніі №2, дзе ўвесь час знаходзіўся ў медчастцы. У зняволенні стан здароўя палітвязня істотна пагоршыўся, яму была зроблена аперацыя на страўнікава-кішачным тракце. Ігар Леднік памёр у турэмным шпіталі ў Калядзічах, куды быў дастаўлены з калоніі. Прычынай смерці стала спыненне сэрца.

9 красавіка 2024 года ў брэсцкім СІЗА памёр Аляксандр Кулініч. Яго абвінавацілі ў абразе А. Лукашэнкі. Суд над ім мусіў адбыцца 16 красавіка. У зняволенні аб смерці пазначана, што Аляксандр Кулініч памёр з-за ішэмічнай хваробы сэрца.

11 кастрычніка 2024 года памёр Дзмітрый Шлетгаўэр, грамадзянін Расійскай Федэрацыі. У пасведчанні аб смерці палітвязня пазначаная ў якасці прычыны механічная асфіксія – часта такі запіс робяць ў выпадку самагубства шляхам павешання. Сваякі палітвязня не вераць у версію самагубства.

Паводле інфармацыі, вядомай на 31 снежня 2024 года ў рэжыме інкамунікада[5] працягвалі ўтрымлівацца:

Максім Знак — з 8 лютага 2023 года (693 дні), Мікалай Статкевіч — з 10 лютага 2023 года (691 дзень), Марыя Калеснікава - з 15 лютага 2023 года (686 дзён), Ігар Лосік — з 20 лютага 2023 года (681 дзень), Сяргей Ціханоўскі — з 9 сакавіка 2023 года (664 дні), Віктар Бабарыка — з 26 красавіка 2023 года (616 дзён), Уладзімір Кніга — з 5 верасня 2023 года (484 дні), Мікалай Банькоў — са снежня 2023 года (больш за 360 дзён), Андрэй Навіцкі — са красавіка 2024 года (больш за 240 дзён), Аляксандр Арановіч — з 6 чэрвеня 2024 г. (209 дзён), Аляксандр Францкевіч — з кастрычніка 2024 г. (больш за 60 дзён).

Марыя Калеснікава з 15 лютага 2023 года на працягу 18 месяцаў прабыла ў рэжыме інкамунікада. Паведамлялася, што ў папраўчай калоніі № 4 іншым зняволеным забараняюць з ёй камунікаваць. 12 лістапада 2024 года ёй было дазволенае спатканне з бацькам пад запіс прапагандысцкага медыя. Пасля гэтага яна працягвае знаходзіцца без сувязі са знешнім светам.

Часта інкамунікада непарыўна звязана рэгулярным змяшчэннем палітвязняў у ШІЗА, дзе яны ўтрымліваюцца без перапіскі, званкоў, спатканняў з сям'ёй і без права на сустрэчу з адвакатам. Так, вядома, што Мікалай Банькоў цягам года ўтрымліваўся ў рэжыме інкамунікада і на працягу дзевяці месяцаў — у ШІЗА.

Спецыяльная дакладчыца па пытанні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі **Анаіс Марэн** у сваім выступе на 56-й сесіі Савета па правах чалавека ААН падкрэсліла, што з прычыны працягласці пазбаўлення кантактаў гэта можа быць прыраўнавана да гвалтоўных знікненняў. Аб гэтым жа заявілі эксперты ААН у сваім звароце да ўладаў Беларусі.

[5] Г.зн. без якой-небудзь сувязі са знешнім светам, у існуючых умовах з'яўляецца разнавіднасцю катаванняў і змяшчае прыкметы гвалтоўнага знікнення.

Таксама на працягу 2024 года было вядома, што ў пэўны перыяд часу ўтрымліваліся ў рэжыме інкамунікада: Паліна Шарэнда-Панасюк — са студзеня па жнівень 2024 года, Уладзімір Гундар — з мая па жнівень 2024 года, Яўген Афнагель — з чэрвеня па жнівень 2024 года.

Агулам палітвязні былі істотна абмежаваныя ў перапісцы, тэлефонных размовах і спатканнях са сваякамі і адвакатамі. Такое становішча стварыла ўмовы для беспакаранага парушэння правоў палітвязняў, у тым ліку — права не падвяргацца катаванням і іншым відам забароненага абыходжання.

Сур'ёзныя парушэнні правоў чалавека ў дачыненні да палітвязняў не абмяжоўваюцца самім фактам адвольнага пазбаўлення волі. Палітвязні працягвалі сутыкацца з рознымі формамі ціску і дыскрымінацыйным абыходжаннем з боку адміністрацый пенітэнцыярных устаноў: змяшчэннем у штрафныя ізалятары (ШІЗА) і памяшканне камернага тыпу (ПКТ), а таксама часовым пераводам на турэмны рэжым.

Так, напрыклад, Ігар Аліневіч на працягу года як мінімум чатыры разы быў змешчаны ў штрафны ізалятар – у красавіку, траўні, чэрвені і верасні. У чэрвені ў ШІЗА ён трымаў галадоўку, з-за чаго быў пераведзены ў турэмны шпіталь з падазрэннем на язву страўніка. З пастаяннымі змяшчэннямі ў ШІЗА і ПКТ працягвала сутыкацца Паліна Шарэнда-Панасюк. Андрэй Пачобут пасля пераводу ў папраўчую калонію № 1 утрымліваўся ў штрафным ізалятары 30 сутак запар, а затым быў змешчаны ў ПКТ на шэсць месяцаў.

Па стане на 31 снежня 2024 года, як мінімум 61 палітвязень былі часова пераведзены і ўтрымліваўся ва ўмовах турэмнага рэжыму ў якасці спагнання, накладзенага судом, за нібыта «злоснае парушэнне ўстаноўленага парадку адбывання пакарання».

Так, Яўген Афнагель, за перыяд адбывання пакарання двойчы быў пераводзены на турэмны рэжым: у 2022 годзе – на тра года, і ў ліпені 2024 года – да канца тэрміну адбывання пазбаўлення волі.

Рэгулярныя пераводы ў ШІЗА і ПКТ часта сканчваліся для палітвязняў новымі крымінальнымі абвінавачваннямі ў «злосным непадпарадкаванні патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы» (арт. 411 Крымінальнага кодэкса), на падставе сукупнасці папярэдніх дысцыплінарных спагнанняў.

Па стане на 31 снежня 2024 года, 53 палітвязні і восем былых палітвязняў, у тым ліку чатыры жанчыны, былі асуджаныя паводле арт. 411 Крымінальнага кодэкса да дадатковых тэрмінаў пазбаўлення волі. Так, напрыклад, **Паліна Шарэнда-Панасюк** і Вікторыя Кульша маюць па тры прысуды па арт. 411 КК, якія падаўжаюць ім тэрмін знаходжання ў няволі – абедзве маюць сур'ёзныя праблемы са здароўем, абедзве сутыкаліся са збіваннямі ў калоніі.

Іван Вярбіцкі, Вячаслаў Маляйчук, Зміцер Дашкевіч, Уладзімір Кніга, Андрэй Навіцкі, Сяргей Раманаў, Яўген Прапольскі двойчы запар былі асуджаныя падчас знаходжання ў

калоніі з мэтай падаўжэння тэрміна палітычна матываванага пазбаўлення волі, а Уладзімір Цыгановіч – тройчы.

Новай формай ціску стаў вымушаны ўдзел палітвязняў у прапагандысцкіх відэа: сем палітвязняў патрапілі ў сюжэты дзяржаўнага тэлебачання.

Пасля вызвалення палітвязні працягваюць знаходзіцца пад строгім кантролем праваахоўных органаў і працягваюць сутыкацца з пераследам. Так, у 2024 годзе стала вядома, пра новы крымінальны пераслед былых палітвязняў **Міхаіла Жамчужнага, Ганны Вішняк** і **Цімура Хайруліна**. **Леанід Судаленка** сутыкнуўся з крымінальным пераследам і асуджэннем in absentia.

У зняволенні працягваюць знаходзіцца як мінімум 190 палітвязняў з сур'ёзнымі праблемамі са здароўем, часта несумяшчальнымі з утрыманнем іх ва ўмовах пазбаўлення волі. Сярод іх, напрыклад, – смяротна хворы Андрэй Войніч, Аляксандр Фядута, які мае сардэчную недастатковасць, хворы на эпілепсію Мікіта Залатароў, Уладзімір Гундар, які не мае адной нагі, палітзняволеная сталога ўзросту з хранічнымі захворваннямі Галіна Дзербыш і іншыя.

Многія палітвязні сутыкнуліся з імклівым пагаршэннем здароўя ў няволі. Так, Марфа Рабкова – праблемы з лімфавузламі і шчытападобнай залозай, вадкасць у малым тазе, **Марыя Калеснікава** – прабадная язва і перытаніт, **Паліна Шарэнда-Панасюк** – хранічны панкрэатыт, Аляксандр Зелюткін – сур'ёзныя праблемы з зубамі, Яўген Бурло – рэцыдыў некрозу тазабедраных суставаў.

**Доступ да правасуддзя, права на абарону і права на справядлівы суд**

З 2020 года судовая сістэма Беларусі перастала быць эфектыўным інструментам прававой абароны: суддзі пазбаўлены незалежнасці і ўбудаваны ў рэпрэсіўную сістэму.

Суддзі працягвалі актыўна выносіць палітычна матываваныя пастановы па адміністратыўных справах. Актыўней за ўсё палітычна матываваныя адміністрацыйныя справы ў 2024 годзе разглядалі суддзі: **Станіслаў Іванюценка, Зінаіда Балаболава, Ігар Волчак, Аляксей Болатаў, Андрэй Бычыла, Наталля Козел, Арцём Падалянец, Ганна Леўсік, Алена Цыганкова, Уладзімір Пазняк, Аляксандр Аляксеенка, Алена Тоўсцік-Самойла, Юліяна Лунцэвіч**.

Беларускія суддзі працягваюць трапляць у санкцыйныя спісы Еўразвяза за вынясенне палітычна матываваных прысудаў і, такім чынам, удзел у рэпрэсіях супраць грамадзянскай супольнасці. У межах 15-га пакета санкцый у дачыненні да ўладаў Беларусі і Расіі, прынятага 16 снежня 2024 года, 11 суддзяў патрапілі ў санкцыйны спіс: **Вера Філанчук, Ірына Прадун, Віталь Сініла, Вадзім Мазоль, Ніна Шастак, Ірына Майко, Васіль Бягун, Яўген Брэган, Аляксандр Махораў, Алеся Осіпава** і **Віктар Новік**.

Адвакатура ў Беларусі не з'яўляецца незалежнай, а знаходзіцца цалкам пад кантролем Міністэрства юстыцыі, якое адказвае за правядзенне кваліфікацыйнага іспыту,

прызначэнне на кіруючыя пасады органаў адвакацкага самакіравання, узбуджэнне дысцыплінарных вытворчасцей у дачыненні да адвакатаў і спыненне дзеяння ліцэнзій.

Беларуская рэспубліканская калегія адвакатаў (БРКА) і абласныя (Мінская гарадская) калегіі адвакатаў, як правіла, не прадстаўляюць інтарэсы і не абараняюць правы сваіх чальцоў, а таксама адмаўляюць у падтрымцы адвакатам, якія сутыкаюцца з ціскам, адвольнымі затрыманнямі і крымінальным пераследам. У сувязі з гэтым упершыню ў санкцыйныя спісы Еўразвяза патрапіў прадстаўнік адвакатуры:

*«На пасадзе старшыні Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў **Аляксей Швакаў** кіраваў і фармаваў палітыку БРК адвакатаў па сістэмных рэпрэсіях у дачыненні да адвакатаў, якія прадстаўляюць кліентаў у палітычна матываваных справах або выступаюць супраць злоўжыванняў. На сваім папярэднім пасту старшыні Мінскай гарадской калегіі адвакатаў ён таксама пераследваў адвакатаў, якія прадстаўляюць кліентаў у палітычна матываваных справах. Такім чынам, ён нясе адказнасць за рэпрэсіі супраць грамадзянскай супольнасці і дэмакратычнай апазіцыі, а таксама за дзеянні, якія падрываюць вяршэнства закона ў Беларусі».*

Вярхоўны камісар ААН па правах чалавека ў дакладзе па Беларусі адзначаў узмацненне ціску на адвакатаў, якія абараняюць асобаў, якім былі прад'яўлены палітычна матываваныя абвінавачанні, у 2022-2023 гадах, паказваючы на пазбаўленне ліцэнзій, вымушаную эміграцыю і затрыманні адвакатаў. У 2024 годзе такі ціск не зменшыўся.

Усяго вядома аб 141 адвакаце, пазбаўленым ліцэнзіі па палітычных матывах. Мінімум 88 адвакатаў сутыкнуліся з крымінальным пераследам, мінімум 23 адвакаты – з адвольнымі затрыманнямі. Шэсць адвакатаў утрымліваюцца ў зняволенні па палітычна матываваных крымінальных справах: Максім Знак, Віталь Брагінец, Аляксандр Данілевіч, Анастасія Лазарэнка, Юлія Юргілевіч, Аляксей Барадка.

Усё гэта стварае перашкоды ў выкананні адвакатамі сваіх прафесійных абавязкаў. З-за ўзмацнення ціску на адвакацкую супольнасць, па палітычна адчувальных справах становіцца складана знайсці адваката.

Адсутнасць незалежнасці судовай сістэмы, яе актыўны ўдзел у пераследзе грамадзянскай супольнасці, дэградацыя інстытута адвакатуры, таксама пазбаўленага незалежнасці і самакіравання, а таксама крыміналізацыя праваабарончай дзейнасці – усё разам істотна ўскладняе доступ да правасуддзя.

**Свабода асацыяцыі**

Глыбокі грамадска-палітычны крызіс адбіўся на ўсіх інстытутах грамадзянскай супольнасці ў Беларусі, якія і да прэзідэнцкіх выбараў 2020 года, якія далі старт асабліва жорсткім рэпрэсіям, дзейнічалі ў строгіх абмяжоўваючых рамках. Празмернае рэгуляванне працэсаў інстытуцыі, рэгістрацыі, фінансавання парушаюць права на свабоду асацыяцый, а агульны рэпрэсіўны фон у максімальнай ступені абмяжоўвае ініцыятыву, асабліва ў адносінах да праваабарончай і палітычнай актыўнасці.

У Беларусі на 1 студзеня 2024 года былі зарэгістраваны чатыры палітычныя партыі, 1 973 грамадскія аб'яднанні і 19 прафсаюзаў. У ліку зарэгістраваных – 101 міжнароднае грамадскае аб'яднанне (уключаючы аддзяленні міжнародных арганізацый), 19 міжнародных і пяць рэспубліканскіх фондаў, 360 рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў, 350 дабрачынных арганізацый, 85 арганізацый нацыянальных меншасцяў, 53 федэрацыі па відах спорту. Акрамя таго, зарэгістравана 471 недзяржаўная ўстанова – гэта форма дзейнасці НДА, працэс заснавання і рэгістрацыі якой значна спрошчаны ў параўнанні з грамадскімі аб'яднаннямі. Варта адзначыць, што на 1 студзеня 2021 года, да пачатку працэсу татальнай зачысткі арганізацый грамадзянскай супольнасці, у рэспубліцы было зарэгістравана 15 палітычных партый, 25 прафесійных саюзаў, 3 021 грамадскае аб'яднанне, з іх 227 міжнародных, 789 рэспубліканскіх і 2 005 мясцовых. На 1 студзеня 2020 года ў Беларусі было зарэгістравана больш за 200 нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў прадстаўнікоў 24 нацыянальнасцей.

Такім чынам, да пачатку 2024 года грамадска-палітычны сектар Беларусі страціў усе апазіцыйныя партыі, усе незалежныя прафсаюзы, усе праваабарончыя арганізацыі, больш за палову арганізацый нацыянальных меншасцяў. Ліквідацыя НДА цягне за сабой немагчымасць легальнага ажыццяўлення дзейнасці: Крымінальны кодэкс прадугледжвае адказнасць па арт. 193-1 за арганізацыю або ўдзел у дзейнасці незарэгістраванага або ліквідаванага грамадскага аб'яднання. Варта адзначыць, што пасля свайго аднаўлення ў Крымінальным кодэксе ў 2022 годзе гэты артыкул на практыцы судом прымяняўся ўпершыню ў жніўні 2024 года ў дачыненні да грамадскай дзяячкі **Вольгі Вялічкі**: яе завочна прызналі вінаватай у тым ліку ў арганізацыі і ўдзеле ў дзейнасці грамадскага аб'яднання, у дачыненні да якога ёсць рашэнне ўпаўнаважанага дзяржаўнага органа аб ліквідацыі, якое ўступіла ў законную сілу, і паводле гэтага абвінавачвання на падставе арт. 193-1 Крымінальнага кодэкса жанчыне прызначылі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на адзін год.

Паводле справаздачы Lawtrend з пачатку 2021 года па 15 лістапада 2024 года прымусова ліквідавана не менш за 1 455 НДА, 11 палітычных партый і чатыры прафесійныя саюзы. З іх у 2024 годзе да 15 лістапада было вынесена не менш як 226 рашэнняў аб ліквідацыі. Не менш за 693 некамерцыйныя арганізацыі прынялі вымушанае рашэнне аб самастойнай ліквідацыі.

Найбольш балючым ударам па свабодзе асацыяцый з'яўляецца працэс прызнання НДА «экстрэмісцкімі фармаваннямі». Прызнанне «экстрэмісцкімі фармаваннямі» грамадскіх арганізацый і іншых НДА крыміналізуе практычна ўсе формы ўзаемадзеяння з гэтымі НДА.

Сярод 88 суб'ектаў, прызнаных «экстрэмісцкімі фармаваннямі» ў 2024 годзе, больш за 40 маюць прыкметы асацыяцыі і знаходзяцца пад абаронай артыкула 22 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.

Экстрэмісцкімі прызнаны ў тым ліку ініцыятывы «Актыўнымі быць файна» («АБФ»), «Школа лідэрства», «Беларуская нацыянальная маладзёжная рада «РАДА», «Адукаванка», Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацы, «Асацыяцыя Палітвязняў

Беларусі», «Фонд медыцынскай салідарнасці Беларусі» , «INeedHelpBY» і шэраг іншых. Рашэнні выносіліся як у дачыненні да ініцыятыў, якія ажыццяўлялі дзейнасць у Беларусі, так і за яе межамі; як у дачыненні да заснаваных беларусамі, так і ў дачыненні да замежных суб'ектаў (Фонд «Свабода і дэмакратыя», «Fund of Belarus friends»).

Працягнуўся пераслед праваабарончых арганізацый: **Алесь Бяляцкі, Валянцін Стэфановіч, Уладзімір Лабковіч, Марыя Рабкова** і **Андрэй Чапюк** утрымліваюцца ў калоніях за праваабарончую дзейнасць «Вясны». «Экстрэмісцкімі фармаваннямі» прызнана ініцыятыва «Politzek.me», Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў – праект праваабарончай «Прававой ініцыятывы», «Лекары за праўду і справядлівасць».

Вядучыя праваабарончыя арганізацыі па-ранейшаму ажыццяўляюць сваю дзейнасць ва ўмовах вымушанай эміграцыі.

Улады жорстка пераследуюць нізавыя самаарганізаваныя структуры грамадзянскай супольнасці. Рашэннем КДБ прызнаны «экстрэмісцкім фармаваннем» дваровая кааліцыя «Ордэн» і дваровыя арганізацыі «Злые когтики», «Сухарава», «Сеніца2.0», «Салідарнасць», «Вольныя ваўкі», «Навагрудскія партызаны», «ВИЛИЯ», «Скромные матрешки» – ініцыятывы, якія праяўлялі актыўнасць у перыяд пратэстаў 2020 года.

Прыметай мінулага года стаў трансгранічны пераслед удзельнікаў палітычных і грамадскіх ініцыятыў, які ўзмацніўся: пад удар трапілі «Народныя пасольствы», 12 спісаў кандыдатаў, якія ўдзельнічалі напрыканцы траўня 2024 года ў выбарах у Каардынацыйную раду – грамадска-палітычную ініцыятыву беларускай апазіцыі, кожны з якіх названы «экстрэмісцкім фармаваннем», і іншыя ініцыятывы беларусаў замежжа.

**Палітычны пераслед за выказванне меркавання. Парушэнне свабоды мірных сходаў**

Дзяржава ігнаруе міжнародныя абавязкі па павазе, абароне і забеспячэнні рэалізацыі правоў на свабоду мірных сходаў і выказвання меркаванняў.

Вядома аб не менш як 1 019 выпадкаў прыцягнення да крымінальнай адказнасці па артыкуле 342 КК (актыўны ўдзел у дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак), 135 выпадкаў – па артыкуле 369 КК (абраза прадстаўніка ўлады) і 245 – па артыкуле 368 КК (абраза Лукашэнкі), 18 – па артыкуле 130 КК (распальванне варожасці ці варожасці), 18 – па артыкуле 391 КК (абраза суддзі), 13 – па артыкуле 367 КК (паклёп на Лукашэнку).

Нягледзячы на тое, што вулічных пратэстных масавых мерапрыемстваў у 2024 годзе зарэгістравана не было, працягваліся затрыманні і прыцягненне да крымінальнай адказнасці за ўдзел у масавых пратэстах супраць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў 2020 года. Суддзі часта прызначалі максімальна суровае пакаранне – пазбаўленне волі,

нягледзячы на тое, што санкцыя артыкула прадугледжвае больш мяккія віды пакаранняў: арышт або абмежаванне волі.

Так, 24 ліпеня па «справе карагодаў« прыцягнулі да адказнасці па ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса **Генадзя Клімашэвіча** і **Крысціну Салаўёву**. Пакаранне – адзін год пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму і паўтара года пазбаўлення волі з адтэрміноўкай выканання пакарання адпаведна. Нагадаем, што паводле ч. 2 арт. 62 Крымінальнага кодэкса, пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі можа быць назначана толькі пры ўмове, што мэты крымінальнай адказнасці не могуць быць дасягнуты прымяненнем больш мяккага пакарання, прадугледжанага адпаведным артыкулам Асаблівай часткі Крымінальнага кодэкса. На ўтрыманні ў Генадзя Клімашэвіча знаходзяцца двое непаўнагадовых дзяцей.

Працягваюць прыцягваць да крымінальнай адказнасці людзей, якія вяртаюцца ў Беларусь пасля жыцця за мяжой. Так, 31 ліпеня ў судзе Кастрычніцкага раёна Гродна разглядалі крымінальную справу па арт. 342 Крымінальнага кодэкса ў дачыненні да **Дзмітрыя Глушчанкі**. Яго затрымалі неўзабаве пасля вяртання з Польшчы.

Тэндэнцыя асуджэння сем'яў захоўваецца. Пад палітычна матываваны крымінальны пераслед часцей за ўсё трапляюць цэлыя сем'і ці групы сваякоў, якія пераследуюцца пераважна па артыкуле 342 Крымінальнага кодэкса.

25 кастрычніка ў судзе Фрунзенскага раёна горада Мінска за ўдзел у пратэстах прыцягнулі да крымінальнай адказнасці дзве сям'і: **Ларысу** і **Алега Петрашкевічаў**, **Сяргея** і **Юлію Купрыенку**. У судзе Баранавіцкага раёна ў межах вялікай групавай справы па падзеях 2020 года разглядалася справа ў дачыненні да **Вадзіма** і **Алега Хільчукоў**. У судзе Ленінскага раёна Брэста ў рамках такой жа групавой справы была разгледжана справа ў дачыненні да **Якава** і **Паўла Дзянейкі**. У судзе Дзяржынскага раёна слухалася справа ў дачыненні да **Івана** і **Кацярыны Бывальцавых**.

Асуджаныя па палітычных матывах падвяргаюцца паўторнаму і наступнаму асуджэнню. Фігурант справы аб масавых беспарадках у Брэсце **Дзмітрый Князеў**, асуджаны ў чэрвені 2021 года, у снежні быў падвергнуты паўторнаму крымінальнаму пераследу па 342 артыкуле Крымінальнага кодэкса. Паўторнаму крымінальнаму пераследу падвергнуты яшчэ адзін фігурант крымінальнай справы аб «масавых беспарадках» у Брэсце – **Дзмітрый Андрасюк**. Будучы асуджаным у верасні 2021 года судом Ленінскага раёна Брэста, ён зноў быў падвергнуты пераследу па артыкуле 342 Крымінальнага кодэкса ў снежні 2024 года. Асуджаны па артыкуле аб «абразе суддзі» ў кастрычніку 2021 года судом Петрыкаўскага раёна Сяргей Язэпчук у снежні 2024 года быў падвергнуты чарговаму крымінальнаму пераследу па тым жа самым артыкуле.

Артыкул 130 Крымінальнага кодэкса (распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці або варажнечы) пасля 2020 года стаў распаўсюджаным інструментам рэжыму для барацьбы з іншадумцамі. Справы па артыкуле 130 КК пераважна тычацца выказванняў у інтэрнэце – публікацый рознага кантэнту з крытыкай рэжыму і негатыўнымі выказваннямі аб прадстаўніках улады,

каментароў у сацыяльных сетках і публічных чатах, а таксама за перадачу звестак аб сілавіках і чыноўніках пратэстным структурам. Але часам гэты артыкул выкарыстоўваецца больш шырока. Па гэтым жа артыкуле судзілі і праваабаронцу Насту Лойку за даклад, і мастака Алеся Пушкіна за карціны. У Беларусі паводле гэтага артыкула асудзілі ўжо 650 чалавек, з іх 106 – жанчыны.

Так, Гродзенскі абласны суд у будынку суда Кастрычніцкага раёна Гродна 22 лістапада разгледзеў крымінальную справу супраць палітвязня Дзмітрыя Голуба па трох артыкулах Крымінальнага кодэкса: ч. 1 арт. 130 (распальванне іншай сацыяльнай варожасці), ч. 1 арт. 368 (абраза Лукашэнкі), ч. 1 арт. 342 (актыўны ўдзел у дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак). Суддзя **Дзмітрый Бубенчык** прызначыў палітвязню чатыры гады пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Па версіі абвінавачання, Дзмітрый з лістапада 2019 года па студзень 2024 года пакідаў каментары ў чатах Telegram і на YouTube-канале аб сілавіках, расійскіх вайскоўцаў, журналістах, прадстаўніках улады і Лукашэнку. Таксама яго абвінавацілі ва ўдзеле ў акцыі пратэсту ў 2020 годзе.

Беларускага стэндап-коміка **Славу Камісарэнку** абвінавацілі ў «паклёпе на Лукашэнку» (арт. 367 КК), «абразе Лукашэнкі» (арт. 368 КК) і «распальванні іншай сацыяльнай варожасці» (арт. 130 КК). У снежні Камісарэнку завочна асудзілі да шасці гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

**Пераслед пад маркай абароны ад пагроз нацыянальнай бяспецы**

У 2024 годзе па артыкуле 356 Крымінальнага кодэкса былі асуджаныя па абвінавачанні ў «здрадзе дзяржаве» не менш за 45 беларускіх грамадзян – гэта амаль столькі ж, колькі было асуджана ў 2020-2023 гадах. Яшчэ 13 замежнікаў асуджана па абвінавачанні ў «шпіянажы» (арт. 358 КК) і «агентурнай дзейнасці» (арт. 358-1 КК). Нявызначаны характар дыспазіцыі адпаведных артыкулаў Крымінальнага кодэкса і закрыты характар судовага працэсу ў сукупнасці з іншымі парушэннямі прынцыпаў справядлівага суда дазваляюць маніпуляваць і злоўжываць прававымі нормамі для палітычна матываванага пераследу, у тым ліку за рэалізацыю антываеннай пазіцыі і свабоды выказвання меркаванняў, якая ўключае пошук і распаўсюджванне інфармацыі.

Паводле артыкула 357 Крымінальнага кодэкса па абвінавачанні ў «змове з мэтай захопу ўлады неканстытуцыйным шляхам» за 2024 год было асуджана 45 чалавек – гэта таксама амаль палова ад усіх асуджаных у 2020-2024 годзе. Абвінавачанні ў дачыненні да фігурантаў такіх спраў надуманыя. Больш за тое, іх прад’яўляюць супраць палітычных і грамадскіх актывістаў у падтрымку існуючага рэжыму, які ўтрымлівае дзяржаўную ўладу насуперак вынікам прайграных у 2020 годзе выбараў прэзідэнта і пазбавіў беларусаў магчымасці канстытуцыйнай змены ўлады.

Не менш як 75 чалавек асуджаныя ў 2024 годзе паводле арт. 361 Крымінальнага кодэкса па абвінавачанні ў «закліках да мераў абмежавальнага характару (санкцыяў), іншых дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы». Такога роду заклікі знаходзяцца пад абаронай арт. 19 Пакта, паколькі ўяўляюць з сябе форму

выказвання меркаванняў. Абмежаванні свабоды выказвання меркаванняў нават пры наяўнасці падстаў павінны быць прапарцыйнымі і не замахвацца на саму сутнасць права. Між тым, санкцыя арт. 361 Крымінальнага кодэкса прадугледжвае магчымасць пазбаўлення волі на тэрмін да 12 гадоў.

У 2024 годзе Павел Кунцэвіч быў асуджаны да чатырох гадоў пазбаўлення волі па ч. 3 арт. 361 Крымінальнага кодэкса за выказванні ў інтэрнэце. Да шасці гадоў пазбаўлення волі па арт. 361 і арт. 342 Крымінальнага кодэкса асудзілі Дзмітрыя Кучука — былога кіраўніка ліквідаванай Беларускай партыі «Зялёныя». Да трох гадоў зняволення асуджаны Уладзімір Нікіцін, затрыманы па вяртанні з Польшчы.

Вялізныя тэрміны пазбаўлення волі атрымалі паводле абвінавачанняў, якія ўключаюць арт. 357 і арт. 361 Крымінальнага кодэкса 20 палітыкаў, актывістаў, экспертаў, вучоных і даследчыкаў па так званай крымінальнай справе «аналітыкаў Святланы Ціханоўскай». Працэс у парадку спецыяльнай вытворчасці праходзіў у Мінскім абласным судзе з 31 мая па 1 ліпеня.

**Пераслед за крытыку дзяржаўных сімвалаў**

За 2024 па арт. 370 Крымінальнага кодэкса «здзек з дзяржаўных сімвалаў» было вынесена мінімум 30 абвінаваўчых прысудаў. З 2020 года ўсяго вядома пра мінімум 211 адпаведных прысудаў.

Крытыка дзяржаўных сімвалаў з'яўляецца часткай свабоды слова[6] і таму пераслед за гэтыя дзеянні з'яўляецца парушэннем з боку дзяржавы, гарантаванага ім жа права на выказванне меркавання.

Пераслед за крытыку, у большасці сваёй, дзяржаўнага сцяга адрозніваецца той суровасцю, што ўласцівая пераследу па палітычных матывах у цэлым. Так, пры наяўных такіх санкцыях артыкула 370 Крымінальнага кодэкса, як штраф, папраўчыя работы і абмежаванне волі, суддзі практычна ва ўсіх выпадках прызначаюць самае жорсткае пакаранне – пазбаўленне волі. Максімальны тэрмін пазбаўлення волі, прадугледжаны гэтым артыкулам, складае тры гады.

Вядомае самае мяккае пакаранне, якое прызначалі суддзі па дадзеным артыкуле, – шэсць месяцаў пазбаўлення волі. Менавіта столькі суддзя Лунінецкага раёна прызначыла палітвязням Артуру Канапацкаму і Артуру Молчану, якіх затрымалі ў ліпені 2024 года за тое, што ў 2021 годзе яны сарвалі чырвона-зялёны сцяг з будынка крамы ў аграгарадку Дзятлавічы.

У чэрвені 2024 года адбылося выязное судовае пасяджэнне ў будынку юрыдычнага факультэта ГрДУ ім. Я. Купалы, падчас якога 23-гадовых палітзняволеных Дар'ю Заяц і

[6] Прынцып 7 Ёханэсбургскіх прынцыпаў дэкларуе: ніхто не можа быць пакараны за крытыку або абразу нацыі, дзяржавы або яе сімвалаў, урада, дзяржаўных ведамстваў або дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, а таксама замежнай нацыі, дзяржавы або яго сімвалаў, урада, дзяржаўных ведамстваў або дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, калі толькі гэтая крытыка або абраза не накіраваны на падбухторванне да гвалтоўных дзеянняў або могуць пацягнуць такія дзеянні.

Валерыю Драгун асудзілі да года калоніі кожную па арт. 370 КК. Гэтае пасяджэнне не толькі ў чарговы раз прадэманстравала жорсткасць пакарання за выказванне меркавання, характэрную для справаў з палітычнай матывацыяй, але і з'яўляецца яшчэ адным прыкладам ужывання практыкі публічных судоў, якія праводзяцца таксама ў ваенкаматах, школах, бюджэтных арганізацыях. Правядзенне паказальных судоў фарміруе атмасферу страху і прыгнечання не толькі для саміх абвінавачаных, але і для ўсіх прысутных, што і з'яўляецца стратэгічнай мэтай уладаў. Падобныя працэсы, у сваю чаргу, парушаюць свабоду ад прыніжаючага годнасць абыходжання і права на справядлівы суд, бо абвінавачаныя сутыкаюцца з імітуемым грамадскім асуджэннем і псіхалагічным ціскам.

Зафіксаваны выпадкі прымянення арт. 370 Крымінальнага кодэкса разам з іншымі артыкуламі, якія выкарыстоўваюцца для пераследу за выказванне меркавання, што ў сукупнасці робіць пакаранне яшчэ больш жорсткім.

Напрыклад, палітвязень Іван Сухамераў, паводле версіі абвінавачання, размяшчаў негатыўныя публікацыі ў дачыненні да Лукашэнкі на сваіх старонках у сацсетках, а таксама матэрыялы, якія заклікаюць міжнародныя арганізацыі да санкцый у дачыненні да Беларусі. Ён жа ўступіў у склад BYPOL, хацеў стаць ваяром палка Кастуся Каліноўскага і данаціў Узброеным сілам Украіны (УСУ). Верагодна, пад вартай ён знаходзіцца з сярэдзіны чэрвеня 2023 года – тады мужчыну арыштавалі паводле арт. 19.11 КаАП (*гл. Пераслед за выказванне меркавання пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам*). 8 красавіка 2024 года ў Гомельскім абласным судзе Івана асудзілі да 10 гадоў пазбаўлення волі і штрафу ў 100 базавых велічыняў (каля 1 200 еўра). Ён быў прызнаны вінаватым адразу па 10 артыкулах Крымінальнага кодэкса, сярод якіх – «здзек над дзяржаўным сцягам», «здрада дзяржаве», «заклік да санкцый» і «ўдзел у дзейнасці тэрарыстычнай арганізацыі».

**Падаўленне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам**

Дэ-факта ўлады Беларусі ў 2024 годзе правялі актыўную дзейнасць па пераследзе людзей за іншадумства, прыкрываючы яе барацьбой з экстрэмізмам і тэрарызмам, якая значна пашырылася за апошнія тры гады і стала асноўнай дзейнасцю сілавых структураў Беларусі.

Выпрацаваны механізм супрацьдзеяння «экстрэмізму» і «тэрарызму» з'яўляецца нічым іншым, як інструментам рэпрэсій, накіраваных на прыгнечанне любых альтэрнатыўных праяў думкі. Улады, грэбуючы міжнароднымі стандартамі ў галіне правоў чалавека, ігнаруюць прынцыпы, якія абмяжоўваюць злоўжыванні антыэкстрэмісцкім заканадаўствам[7]. Гэта праяўляецца як у самім заканадаўстве, так і ў

[7] Напрыклад, п. 46 Заўваг агульнага парадку № 34 Камітэта па правах чалавека ўстанаўлівае, што такія правапарушэнні як «заахвочванне тэрарызму» і «экстрэмісцкая дзейнасць» павінны мець дакладныя вызначэнні для гарантыі таго, што іх прымяненне не вядзе да недарэчнага або неадпаведнага ўмяшання ў ажыццяўленне права на свабоднае выказванне меркаванняў.

яго адвольным і палітычна матываваным прымяненні[8], наносячы значны ўрон асновам прававой дзяржавы і правам грамадзян.

У выніку створанай заканадаўчай рамкі і сістэмнай працы, накіраванай на канкрэтныя мэты прыгнечання іншадумства, эфектыўна працуе механізм па знішчэнні ўсіх формаў і відаў нелаяльнасці да ўлады, праяў альтэрнатыўных пунктаў гледжання і жорсткага цэнзуравання. Улады ў сваёй рыторыцы аперуюць такімі паняццямі, як «спыненне дэструктыўнай дзейнасці» і «прадухіленне распаўсюджвання экстрэмісцкіх ідэй[9]«, скажаючы іх сутнасць зручным для сябе чынам.

Прызнанне арганізацый грамадзянскай супольнасці, СМІ і іншых аб'яднанняў грамадзян «экстрэмісцкімі фармаваннямі» парушае свабоду сходаў (*гл. Свабода асацыяцыі*), што стварае падставу для пераследу асобна ўзятых людзей: пагражае крымінальная адказнасць стваральнікам, удзельнікам, падтрымліваючых і тых, хто з гэтымі аб'яднаннямі ўзаемадзейнічае любым іншым спосабам.

7 сакавіка 2024 года Гомельскі абласны суд завяршыў разгляд крымінальнай справы палітвязня Алега Дзегцярэнкі, якога абвінавацілі ва «ўдзеле ў экстрэмісцкім фармаванні» (ч. 3 арт. 361-1 Крымінальнага кодэкса) і «фінансаванні тэрарыстычнай дзейнасці» (ч. 2 арт. 290- 1 Крымінальнага кодэкса) і прызначылі яму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на восем з паловай гадоў і штраф у памеры 100 базавых велічыняў (каля 1 200 еўра ў эквіваленце).

Абнаўленне пераліку экстрэмісцкіх матэрыялаў па сутнасці сваёй з'яўляецца ўлікам забароненай інфармацыі, які ўключае ў сябе творы мастацтва, навуковыя працы, публікацыі, медыяматэрыялы, праваабарончыя і палітычныя матэрыялы. Гэты працэс тычыцца як гістарычных і культурных каштоўнасцяў, такіх як творы Янкі Купалы і Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, так і сучасных публікацый, песень і старонак у сацыяльных сетках. Асаблівая ўвага надаецца матэрыялам, якія маюць палітычны ці праваабарончы кантэкст.

Працэс прызнання матэрыялаў экстрэмісцкімі ўяўляе сабой шматэтапную бюракратычную працэдуру, якая мусіць забяспечыць кантроль над інфармацыйнай прасторай краіны. Гэты працэс уключае чатыры асноўныя этапы: ініцыятыва, ацэнка, суд і ўключэнне ў спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Ключавую ролю ў дадзенай схеме адыгрываюць дзяржаўныя органы, закліканыя па законе змагацца з экстрэмізмам (ад МУС і пракуратуры да мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў). Яны падаюць запыты ў спецыяльныя камісіі, якія аналізуюць матэрыялы на прыкметы экстрэмізму. Дзейнасць гэтых органаў характарызуецца празмернай справаздачнасцю, накіраванай на дэманстрацыю высокіх вынікаў, што прыводзіць да палітычна матываванага і непразрыстага працэсу ацэнкі матэрыялаў, арыентаванага на ўгодніцтва перад кіраўніцтвам і павелічэнне паказчыкаў эфектыўнасці.

---

[8] Глядзіце Даклад «Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад маркай барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам», 2024: https://spring96.org/files/book/ru/ogranichenie_svobody_mnenia_2024.pdf

[9] Тэлеграм канал Следчага камітэту Рэспублікі Беларусь: https://t.me/skgovby/12199

Канчатковае рашэнне аб прызнанні матэрыялаў экстрэмісцкімі прымаецца ў закрытым судовым працэсе, якія праходзяць як правіла непублічна, а абскарджанне практычна немагчыма. У 2024 годзе суды паставілі рэкорд па колькасці прызнаных экстрэмісцкіх матэрыялаў: усяго было вынесена 1 444 рашэнні аб прызнанні інфармацыйнай прадукцыі, сімволікі, атрыбутыкі, друкаваных і кніжных выданняў «экстрэмісцкімі матэрыяламі», што складае 40,5% ад агульнай колькасці адпаведных рашэнняў з 2008 года. Агулам на канец лістапада 2024 года ў Пераліку налічвалася 6 565 адзінак прадукцыі на падставе больш як 3 500 судовых рашэнняў, каля 2 000 з іх унесена ў спіс у 2024 годзе; тры рашэнні за 2024 год былі адменены вышэйстаячымі судамі.

Прызнаннем альтэрнатыўнай афіцыйнай ідэалогіі інфармацыі экстрэмісцкімі матэрыяламі ўлады не абмяжоўваюцца. Адначасова з гэтым яны вядуць мэтанакіраваную ідэалагічную працу, пранікаючы ва ўсе сферы жыцця грамадства: рэлігію, адукацыю, культуру і эканоміку. У афіцыйных заявах гучаць сцвярджэнні аб неабходнасці фармавання «імунітэту» ў грамадстве супраць так званых экстрэмісцкіх ідэй[10], што фактычна азначае гвалтоўнае навязванне адной ідэалогіі і знішчэнне свабоды думкі.

Вядзенне ўліку забароненай інфармацыі суправаджаецца такім незаконным практыкам, як праверка тэлефонаў, у тым ліку асабістыя перапіскі, з мэтай выяўлення інфармацыі з пераліку экстрэмісцкіх матэрыялаў. Па арт. 19.11 КаАП (распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць) за рэпосты, перасылку ў асабістыя паведамленні, падпіскі ў сацсетках, матэрыялаў, якія ўнесены ў «Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў» прадугледжана адміністрацыйныя адказнасць. Пераслед па гэтым артыкуле ў 2024 годзе замацаваўся як самы часта выкарыстоўваны (*гл. Адміністрацыйны і крымінальны пераслед па палітычных матывах*). Акрамя таго, разам з ужываннем арт. 19.11 КаАП працягвае выкарыстоўвацца практыка «каруселяў»[11], а затрыманне і наступны арышт па гэтым артыкуле часта выкарыстоўваецца як нагода ўтрымання чалавека ў няволі для гвалтоўнага атрымання паказанняў, якія з'яўляюцца падставай для больш сур'ёзнага пераследу чалавека – у межах крымінальнага заканадаўства.

Так, Максім Хвашчынскі, які быў затрыманы на наступны дзень пасля вяртання з Польшчы, спачатку быў асуджаны па адміністрацыйным артыкуле 19.11 КаАП (распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў). Потым супраць яго завялі крымінальную справу па ч. 1 і ч. 2 арт. 361-1 Крымінальнага кодэкса (стварэнне экстрэмісцкага фармавання). Па версіі абвінавачання, Максім датычны да стварэння «экстрэмісцкага» тэлеграм-чата «Бабруйск 375», тэлеграм-чата «Бобр 97%». Акрамя таго, яго абвінавачваюць у «паклёпе на Лукашэнку» (арт. 367 Крымінальнага кодэкса). Справу палітвязня разглядалі 18 і 27 верасня 2024 года ў Магілёўскім абласным судзе. Суддзя **Ігар Шведаў** асудзіў палітвязня да сямі гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

---

[10] Тэлеграм-канал Следчага камітэту Рэспублікі Беларусь: https://t.me/skgovby/12156
[11] Адміністрацыйны арышт, які прымяняецца некалькі разоў запар.

Фармалізацыя рэпрэсій з дапамогай спісаў, апроч спісу экстрэмісцкіх матэрыялаў і экстрэмісцкіх фармаванняў, адбываецца таксама і адносна асобна ўзятых людзей.

Пералік асоб, якія маюць дачыненне да тэрарыстычнай дзейнасці вядзе КДБ. На канец 2024 года ў ім налічваецца 517 грамадзян Беларусі. Па палітычных матывах у спіс таксама ўключаны адзін грамадзянін Латвіі, адзін грамадзянін Германіі, тры грамадзяніны Расіі і чатыры грамадзяніны Украіны. Пад маркай «барацьбы з тэрарызмам» улады ўводзяць фінансавыя абмежаванні для асоб, унесеных у гэты пералік, што фактычна пазбаўляе палітзняволеных, асуджаных па «тэрарыстычных» артыкулах, магчымасці атрымліваць грашовыя пераводы. Апроч гэтага, у 2024 годзе ўлады пачалі актыўна пераследаваць тых, хто падтрымлівае палітвязняў, у тым ліку фінансава, публічна называючы іх спонсарамі экстрэмізму[12] (*гл. Пераслед за праяву салідарнасці і дапамогі*).

Сярод іншых выпадак **Рыка Крыгера**, асуджанага да смяротнага пакарання (*гл. Ужыванне смяротнага пакарання*), ілюструе выкарыстанне абвінавачанняў у тэрарызме як інструмента палітычных рэпрэсій, а не барацьбы з рэальнымі пагрозамі. Асуджэнне да смяротнага пакарання за дзеянні, якія не прывялі да чалавечых ахвяр, дэманструе неадпаведнасць пакарання і дыскрэдытацыю прынцыпу справядлівасці. Смяротны прысуд, вынесены па палітычных матывах, падкрэслівае маніпулятыўны характар абвінавачванняў у «тэрарыстычнай» дзейнасці, што пацвярджаецца наступным вызваленнем Крыгера па абмене. Выкарыстоўваемы падыход стварае падставы для сумневаў у абгрунтаванасці прымянення тэрміна «тэрарызм» у дадзеных выпадках, ператвараючы яго ў інструмент ціску, а не правасуддзя.

Пералік асоб, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці, вядзецца МУС, якое ўключае ў яго абвінавачаных у злачынствах «экстрэмісцкай» накіраванасці. На канец 2024 года пералік налічваў 4 808 чалавек. За 2024 год насуперак сцвярджэнням афіцыйных асоб адзначаецца рост колькасці распачатых крымінальных спраў «экстрэмісцкай накіраванасці» (*гл. Адміністрацыйны і крымінальны пераслед па палітычных матывах*). Уключэнне ў пералік асоб, якія маюць дачыненне да «экстрэмісцкай дзейнасці», ператварае людзей, названых «экстрэмістамі» ў сацыяльна ізаляваных грамадзян, істотна абмяжоўваючы іх правы і свабоды. Дадатковыя меры паражэння ў правах дзейнічаюць як у час адбывання пакарання, так і на працягу пяці гадоў пасля яго завяршэння (зняцця або пагашэння судзімасці), ствараючы доўгатэрміновыя сацыяльныя і эканамічныя бар'еры для рэабілітацыі. Фінансавы кантроль, які фактычна блакуе магчымасць карыстацца банкаўскімі паслугамі без дазволу, пазбаўляе людзей базавых магчымасцяў для забеспячэння свайго існавання, што ў першую чаргу тычыцца палітвязняў.

Забарона на заняткі педагагічнай, выдавецкай, дзяржаўнай і ваеннай дзейнасцю, а таксама на працу з небяспечнымі матэрыяламі ўзмацняе сацыяльную ізаляцыю і стыгматызацыю, падрываючы шанцы на вяртанне да паўнавартаснага жыцця. Гэтыя меры выходзяць за рамкі правасуддзя, ператвараючыся ў інструмент прыгнечання і

[12] Тэлеграм-канал Следчага камітэту Рэспублікі Беларусь: https://t.me/skgovby/10877

сістэмнай дыскрымінацыі. Такая сістэма не толькі ўзмацняе рэпрэсіўны кантроль, але і дэманструе мэтанакіраванае выкарыстанне заканадаўства для пераследу і маргіналізацыі тых, хто не даспадобы ўладзе.

Такім чынам, і ў 2024 годзе барацьба з «экстрэмізмам» і «тэрарызмам» цалкам замяніла сваю сутнасць на пераслед іншадумцаў, гэтая тэндэнцыя замацавалася і набрала значныя абароты. Уся дзяржаўная сістэма, у тым ліку судовая сістэма, працуе як зладжаны механізм, забяспечваючы пастаяннае абнаўленне спісаў і пераслед тых, хто трапляе пад найменшае падазрэнне ў так званай экстрэмісцкай дзейнасці. Гэты працэс стаў неад'емнай часткай рэпрэсіўнай палітыкі прадстаўнікоў А. Лукашэнкі, накіраванай на прыгнечанне іншадумства і ўзмацненне кантролю над грамадствам.

**Пераслед за праяву салідарнасці і дапамогі**

Калі 2023 год адзначыўся вызначэннем прынцыпова новага вектару пераследу за праявы салідарнасці і дапамогі рэпрэсаваным, то 2024 год замацаваў і пашырыў гэтую практыку. Так, год пачаўся з масавага пераследу па справе, звязанай з дапамогай ад ініцыятывы INeedHelpBY, якую ўлады прызналі «экстрэмісцкім фармаваннем» (*гл. Падаўленне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам*). У студзені 2024 года праз ператрусы, допыты і затрыманні прайшлі больш за 300 чалавек. Паведамляецца, што ў пастановах на ператрусы былі пазначаныя крымінальныя артыкулы за «фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці» (арт. 361-2 Крымінальнага кодэкса) і «садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці» (арт. 361-4 Крымінальнага кодэкса). Рэпрэсаваныя па гэтай справе – сваякі, блізкія і сябры палітвязняў, а таксама былыя палітвязні. Як мінімум, 150 сваякоў і блізкіх палітвязняў сутыкнуліся з пераследам па ч. 2 арт. 24.15 КаАП «выкарыстанне замежнай бязвыплатнай дапамогі для ажыццяўлення тэрарыстычнай і іншай экстрэмісцкай дзейнасці або іншых дзеянняў, забароненых заканадаўствам». Гэты артыкул раней не выкарыстоўваўся ў Беларусі. Нагодай для пераследу стала дапамога сем'ям палітвязняў з дастаўкай ежы праз ад ініцыятывы INeedHelpBY. У якасці пакарання людзі былі вымушаныя выплаціць вялікія штрафы і кампенсацыю ў памеры атрыманай «замежнай выплаты».

Таксама пад пераслед за салідарнасць патрапілі тыя, хто дасылаў палітвязням невялікія грашовыя пераводы ці лісты падтрымкі. Так, траіх жыхароў Жодзіна затрымалі ў лістападзе і абвінавачваюць у «стварэньні экстрэмісцкага фармаваньня ці ўдзеле ў ім» (арт. 361-1 Крымінальнага кодэксу). Паводле КДБ, яны маюць дачыненне да ініцыятывы «письмо.бел»[13] – сэрвісу для адпраўкі лістоў зняволеным, якім карысталіся тысячы беларусаў.

Ініцыятыва «письмо.бел» была афіцыйна зарэгістраваная і функцыянавала ў прававым полі з 2018 года, аказваючы выключна гуманітарную дапамогу і спрашчаючы адпраўку

[13] 12 лістапада суд Партызанскага раёна Мінска прызнаў «экстрэмісцкімі матэрыяламі» сайт ініцыятывы «письмо.бел», а таксама яе старонкі ў сацсетках. Сэрвіс дапамагаў адпраўляць лісты вязням «не адыходзячы ад кампутара ці тэлефона». Пазней ён перастаў адчыняцца - стаў недасяжны ў Беларусі і за яе межамі. 15 лістапада КДБ прызнаў сэрвіс «экстрэмісцкім фармаваннем».

лістоў вязням праз дамову з дзяржаўнай «Белпоштай». З мэтай задушыць салідарнасць з палітвязнямі нягледзячы на тое, што сэрвіс быў карысны і іншым зняволеным, улады інтэрпрэтавалі яе дзейнасць як экстрэмісцкую, што ў чарговы раз дэманструе абсурдны падыход да вызначэння экстрэмізму. (*Гл. Падаўленне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам*).

На сённяшні дзень па справе салідарнасці з палітвязнямі асудзілі не менш за 37 чалавек, сярод якіх толькі адзін мужчына, астатнія – жанчыны, большасць з іх ва ўзросце больш за 50 гадоў. Паводле абвінавачанняў, яны бралі інфармацыю пра палітвязняў са старонак праваабарончых ініцыятываў, якія з'яўляюцца забароненымі, бо яны былі прызнаныя «экстрэмісцкімі фармаваннямі».

Так, 55-гадовую бібліятэкарку з Брэста Ірыну Пагадаеву затрымалі ў траўні 2024 года і абвінавацілі ў «садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці» (ч. 1 і 2 арт. 361-4 Крымінальнага кодэкса) за тое, што жанчына адпраўляла грашовыя пераводы палітвязням у СІЗА. Усяго Ірына пералічыла 188 беларускіх рублёў. У ліпені ў Брэсцкім абласным судзе ёй прызначылі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення свабоды тэрмінам тры гады калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Палітзняволеную 50-гадовую Аксану Ляпко затрымалі ў студзені 2024 года падчас рэйду сілавікоў па сваяках палітвязняў за атрыманне імі прадуктовых перадач ад ініцыятывы IneedHelpBY. Першапачаткова палітзняволеную абвінавацілі ў «фінансаванні экстрэмісцкай дзейнасці» (арт. 361-2 КК), але пасля абвінавачанне змянілі на «садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці» (арт. 361-4 КК). У Гродзенскім абласным судзе ў верасні Аксану асудзілі на тры гады калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Маці былой палітвязні **Вольгі Такарчук** 64-гадовую Ірыну затрымалі ў студзені 2024 года па справе прадуктовых перадач сем'ям палітвязняў. Жанчыну адвезлі ў КДБ на допыт, пасля чаго прад'явілі абвінавачанні па арт. 361-4 Крымінальнага кодэкса (садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці). У жніўні 2024 года ў дачыненні да Ірыны Мінскі гарадскі суд вынес абвінаваўчы прысуд – пазбаўлення волі тэрмінам на тры гады.

У лютым 2024 года з выступу старшыні Следчага камітэта Беларусі Д. Гары стала вядома, што за 2023 год беларусы былі вымушаныя выплаціць у выглядзе «дабрачынных ахвяраванняў» адкупныя на суму, якая перавышае 37 млн. беларускіх рублёў (каля 10,7 млн. еўра). Нягледзячы на заяўленыя дабрачынныя мэты, канчатковым бенефіцыярам выплат выступае дзяржаўны бюджэт. Да выплатаў пад пагрозай адвольнага прыцягнення да крымінальнай адказнасці прымушалі людзей, якія па выніку ахвяравалі грошы на падтрымку розных ініцыятыў салідарнасці, пасля прызнаных экстрэмісцкімі фармаваннямі.

Не ва ўсіх атрымалася пазбегнуць пераследу за ахвяраванні: за год было вынесена як мінімум 60 абвінаваўчых прысудаў па артыкуле 361-2 Крымінальнага кодэкса «фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці».

Палітзняволеная Наталля Левая пасля пачатку вайны ва Украіне выехала ў Польшчу, дзе працавала 2D-ілюстратаркай. А зімой 2023 года яна вырашыла вярнуцца на радзіму, дзе яе і затрымалі. Па версіі абвінавачання, Наталля Левая на працягу 2021-2022 гадоў нібыта пералічыла на банкаўскія рахункі прадстаўнікоў «экстрэмісцкіх фармаванняў», у тым ліку палка Каліноўскага, агульную суму каля 1 275 еўра. У ліпені 2024 года ў Брэсцкім абласным судзе ў дачыненні да Наталлі вынеслі прысуд па трох крымінальных артыкулах, асудзіўшы яе да шэсці гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Таксама за данаты палку Каліноўскага і ў фонд салідарнасці «Байсол» асудзілі 57-гадовага маладзечанца Аляксандра Верасовіча. У красавіку ў Мінскім абласным судзе яму прызначылі шэсць гадоў пазбаўлення волі па двух крымінальных артыкулах: «фінансаванне дзейнасці экстрэмісцкага фармавання» (арт. 361-2 Крымінальнага кодэкса) і «фінансаванне ўдзелу на тэрыторыі замежнай дзяржавы ў ваенных дзеяннях» (ч. 2 арт. 361-3 Крымінальнага кодэкса).

У снежні прапагандысцкія дзяржаўныя рэсурсы распаўсюдзілі інфармацыю аб затрыманнях актывістаў гуманітарных ініцыятыў, якія аказваюць падтрымку ахвярам палітычна матываванага пераследу – «Байхелп» і «Байсол».

Гэта не спыняе дзейнасць беларускіх праваабарончых арганізацый па аказанні розных відаў дапамогі палітвязням і іншым ахвярам рэпрэсій. Акрамя гэтага, у верасні 2024 года беларускія палітычныя структуры і гуманітарныя ініцыятывы пры падтрымцы Нарвежскага Хельсінкскага камітэта заявілі аб пачатку працы Міжнароднага гуманітарнага фонду дапамогі беларускім палітвязням і іх родным, у склад якога ўвайшлі праваабаронцы НХК і прадстаўнікі ініцыятыў «Байхелп», «Байсол», «Краіна для жыцця», «Вольныя», INeedHelpBY і Dissidentby.

**Прымусовая праца**

У Беларусі да гэтага часу выкарыстоўваецца прымусовая праца ў розных формах: у выглядзе суботнікаў, прыцягнення школьнікаў да ўборкі ўраджаю, прымусовага размеркавання выпускнікоў ВНУ, працы ў папраўчых установах, уключаючы лячэбна-працоўныя прафілакторыі (ЛПП). Міжнародная арганізацыя працы і праваабаронцы неаднаразова ўказвалі беларускаму ўраду на парушэнні міжнародных абавязкаў, якія датычацца забароны на прымусовую працу.

Па-ранейшаму дзейнічае сістэма лячэбна-працоўных прафілакторыяў, якая абуральна парушае правы чалавека, якая дазваляе пазбаўляць волі на тэрмін да двух з паловай гадоў залежных ад алкаголю і іншых псіхаактыўных рэчываў, якія не здзяйснялі супрацьпраўных дзеянняў або ўжо панеслі за іх пакаранне.

З 26 студзеня 2024 года ўступілі ў сілу новыя палажэнні Закона «Аб парадку і ўмовах накіравання грамадзян у лячэбна-працоўныя прафілакторыі і ўмовах знаходжання ў іх». З ліку патэнцыйных зняволеных выключаны «працаздольныя непрацуючыя грамадзяне, якія вядуць асацыяльны лад жыцця» і «асобы, якія абавязаны кампенсаваць дзяржаве выдаткі на ўтрыманне дзяцей» — гэта можна звязаць з ціскам

на беларускія ўлады з боку міжнародных арганізацый, уключаючы Міжнародную арганізацыю працы. Разам з тым, умовы накіравання залежных у ЛПП спрасціліся і да іх дадалі новую катэгорыю — грамадзяне, якія звярталіся (паступалі) у медыцынскую ўстанову ў сувязі з атручэннем, выкліканым спажываннем псіхаактыўных рэчываў, былі папярэджаны аб магчымасці накіравання ў ЛПП і на працягу года паўторна звярнуліся ў медустанову з той жа нагоды, пакутуючы на хранічны алкагалізм, наркаманію або таксікаманію.

Зняволеныя ЛПП паўсюдна прыцягваюцца да цяжкай нізкааплатнай працы пад пагрозай змяшчэння ў ізалятар і/ці падаўжэння тэрміну зняволення. Цяпер у Беларусі дзевяць ЛПП, з іх шэсць мужчынскіх і тры жаночыя; пад ЛПП, у прыватнасці, перададзена расфармаваная папраўчая калонія № 5 у г. Івацэвічы, прызначаная для ўтрымання каля 2 000 зняволеных. Пасля зніжэння колькасці напрамкаў у ЛПП у 2020 годзе, калі ў ЛПП было накіравана 4 494 чалавекі, статыстыка запаўнення ЛПП не публікуецца, а судовая статыстыка малаінфарматыўная, бо змяшчае дадзеныя не толькі аб накіраванні, але і аб скарачэнні і падаўжэнні тэрміну знаходжання ў ЛПП.

Тым не менш можна адзначыць рост колькасці такіх рашэнняў з 6 295 у 2021 годзе да 9 541 у 2023 і да 5 366 толькі за першае паўгоддзе 2024 года.

Асабліва жорсткай эксплуатацыі з прыкметамі рабскай працы падвяргаюцца асуджаныя ў папраўчых калоніях. Яны прыцягваюцца да абавязковай працы без заключэння працоўнай дамовы пад пагрозай дысцыплінарнага ці крымінальнага пакарання, часта працуюць за нікчэмна малую ўзнагароду ў цяжкіх умовах і без уліку кваліфікацыі.

Асуджаныя да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу таксама абавязаны працаваць — іх прымушаюць пад пагрозай замены пакарання на пазбаўленне волі заключаць працоўныя дамовы з названымі адміністрацыяй суб'ектамі, часта на заведама нявыгадных умовах і без уліку кваліфікацыі.

Да некваліфікаванай нізкааплатнай працы ў абавязковым парадку прыцягваюцца так званыя «абавязаныя асобы», якія адбываюць адміністрацыйны арышт.

У 2024 годзе праваабаронцамі неаднаразова фіксаваліся выпадкі прымусовага накіравання на сельскагаспадарчыя працы і на прыбіранне вуліц раней судзімых або грамадзян, якія адбываюць абмежаванне волі.

Суботнікі сталі правераным сродкам папаўнення бюджэту: работнікі вымушаны адпрацоўваць бясплатна некалькі дзён на працягу года або пералічваць уласныя сродкі замест адпрацоўкі; канчатковым бенефіцыярам гэтых сродкаў з'яўляецца дзяржаўны бюджэт. У прыватнасці, 20 красавіка 2024 года ўдзельнікамі рэспубліканскага суботніка, у якім прынялі ўдзел 2,35 мільёна чалавек, у бюджэт было пералічана 15,8 мільёнаў беларускіх рублёў. Акрамя рэспубліканскага на працягу года праводзяцца яшчэ і мясцовыя суботнікі: напрыклад, у Глыбоцкім раёне апроч рэспубліканскага 6 красавіка і 5 кастрычніка 2024 года былі праведзены раённыя суботнікі — заробленыя і сабраныя грошы пералічваліся на рахунак органа выканаўчай улады. У Віцебску пасля

рэспубліканскага прайшлі гарадскія суботнікі 22 чэрвеня і 12 кастрычніка, а 7 верасня яшчэ адзін суботнік правёў Чыгуначны раён Віцебска.

Адмова ад удзелу ў суботніку фармальна магчымы, але можа стаць прычынай пераследу супрацоўніка.

**Дыскрымінацыя. Парушэнне правоў ЛГБТК+**

У 2024 годзе ў Беларусі, ва ўмовах адсутнасці ўсеахопнага антыдыскрымінацыйнага заканадаўства і дзейсных механізмаў прававой абароны, захоўваліся значныя праблемы з забеспячэннем роўнасці і інклюзіі ў розных сферах. Асабліва трывожным было ўзмацненне негатыўных тэндэнцый у адносінах да асобных сацыяльных груп.

Беспрэцэдэнтнымі былі рэпрэсіі ў дачыненні да ЛГБТК+ супольнасці, якія праяўляліся як на ўзроўні заканадаўчых змен, так і ў пераследзе асобных асобаў.

Беларускія ўлады прыраўнялі[14] і тым самым крыміналізавалі дэманстрацыю нетрадыцыйных сэксуальных адносін да парнаграфіі — такія меры адлюстроўваюць імкненне ўладаў капіяваць рэпрэсіўную палітыку Расіі ў дачыненні да ЛГБТК+ асоб. У 2024 годзе ўзмацнілася рыторыка[15] дзяржаўнай прапаганды супраць ЛГБТК+ супольнасці, якая суправаджаецца затрыманнямі і гвалтам. Паводле даных беларускай транс-арганізацыі TG House, у верасні 2024 года ў розных гарадах Беларусі былі затрыманыя і падвергнутыя гвалту больш за 30 квір-актывістаў, у тым ліку як мінімум 10 транс-персон, некаторыя з якіх сутыкнуліся з сур'ёзнымі абвінавачваннямі і пагрозай турэмнага зняволення. Акрамя таго, паведамлялася аб выпадках, калі трансгендэрных людзей прымушалі адмовіцца ад пераходу, што пагаршае дыскрымінацыю і парушае іх правы. Гэтыя рэпрэсіўныя меры прывялі да росту колькасці ЛГБТК+ асоб, якія шукаюць прытулак за мяжой, баючыся пераследу і адмовы ў прадастаўленні неабходных медыцынскіх паслуг.

Актыўна набірала абароты дыскрымінацыя па палітычных матывах, накіраваная супраць асоб, якіх улады лічаць «іншадумцамі» або «апазіцыяй». Падобнае таргетаванне не абмяжоўвалася пра-дэмакратычнымі палітыкамі, актывістамі і праваабаронцамі, але ахоплівала больш шырокае кола «нелаяльных» грамадзян. Дзяржаўныя і праўладныя медыя актыўна выкарыстоўвалі некарэктную лексіку і мову варожасці ў дачыненні да дадзенай групы асоб спрыяючы іх дыскрэдытацыі і ізаляцыі ў грамадстве. Яскравы прыклад – затрыманне мужчыны за татуіроўку з антываенным лозунгам (можа ўказваць на асуджэнне саўдзелу беларускіх уладаў у ваеннай агрэсіі Расіі супраць Украіны) і нацыянальным гербам Пагоня (можа ўказваць на падтрымку прадэмакратычных палітычных сіл і непрызнанне легітымнасці дэ-факта прэзідэнта).

У працоўным заканадаўстве, адзінай сферы дзе заканадаўча замацавана паняцце дыскрымінацыі, дадаткова была ўведзеная прамая забарона на ўказанне ў вакансіях патрабаванняў, звязаных з полам, расай, нацыянальнасцю і іншымі

[14] Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 19 сакавіка 2024 г. № 24
[15] Гл. Маніторынг рыторыкі беларускай прапаганды ў дачыненні да ЛГБТ+ супольнасці ў 2024 годзе

дыскрымінацыйнымі прыкметамі. Тым не менш, працягваў існаваць шэраг дыскрымінацыйных практык у сферы працы: прадузятасць пры працаўладкаванні асоб з ліку этнічных і іншых сацыяльных уразлівых груп, абмежаванні для прафесійнай рэалізацыі беларускамоўных грамадзян.

Сітуацыя з расавай дыскрымінацыяй у Беларусі ў 2024 годзе заставалася без істотных паляпшэнняў. У выніку ліквідацыі або забароны дзейнасці шматлікіх арганізацый грамадзянскай супольнасці, якія прадстаўлялі гэтыя меншасці, пагоршылася сітуацыя з доступам меншасцяў да сродкаў прававой абароны. Напрыклад, у жніўні 2024 года Міністэрства ўнутраных спраў унесла польскі фонд «Свабода і дэмакратыя» ў спіс экстрэмісцкіх фармаванняў, што стала часткай антыпольскай палітыкі рэжыму. Асабліва ўразлівым заставаліся ромы, якія сутыкаліся з прадузятым стаўленнем, цяжкасцямі ў працаўладкаванні і абмежаваным доступам да сацыяльных паслуг.

Гендэрная няроўнасць у Беларусі застаецца значнай праблемай, выяўляючыся ў розных сферах грамадскага жыцця: узроўні заробку, палітычным удзеле, праблеме хатняга гвалту, існуючым у грамадстве стэрэатыпам і дыскрымінацыі.

**Пераслед журналістаў, супрацоўнікаў СМІ і блогераў**

Беларусь з'яўляецца самай небяспечнай краінай у Еўропе для журналістаў і займае 167 (са 180) пазіцыю ў Сусветным індэксе свабоды прэсы арганізацыі «Рэпарцёры без межаў» (RSF) за 2024 год. Па стане на снежань 2024 года, пазбаўленыя волі, паводле дадзеных БАЖ, 45 журналістаў і супрацоўнікаў СМІ і, паводле «Вясны», 19 блогераў. Як заявіў Спецыяльны дакладчык па пытанні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, гэта больш за чатыры адсоткі ад агульнай колькасці журналістаў у свеце, якія знаходзяцца ў турмах (A/HRC/56/65, пункт 57).

Ператрусы і затрыманні, прыцягненне да адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці журналістаў, супрацоўнікаў медыя і блогераў, блакіроўка значных для грамадскасці рэсурсаў з мэтай кантролю інфармацыйнай прасторы і абмежавання доступу да альтэнатыўных крыніц інфармацыі ў Беларусі працягнуліся ў 2024 годзе.

Найбольшай колькасці прадстаўнікоў медыя прад'яўлены абвінавачанні па арт. 130 Крымінальнага кодэкса (распальванне варожасці ці варожасці).

Самыя распаўсюджаныя крымінальныя артыкулы, па якіх асуджалі, або прад'явілі абвінавачанне прадстаўнікам СМІ і блогерам – «стварэнне або ўдзел у экстрэмісцкім фармаванні» (ч. 1 або ч. 3 арт. 361-1 КК), «распальванне сацыяльнай варожасці або варажнечы» (арт. .130 КК), «садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці» (ч. 1 і ч. 2 арт. 361-4 КК).

Далей па колькасці прыгавораў сітуацыя выглядае наступным чынам:

За «арганізацыю і падрыхтоўку дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо ўдзел у іх» (ч. 1 арт. 342 КК) асуджаныя сем чалавек;

Па пяць прысудаў: за «дыскрэдытацыю Беларусі» (арт. 369-1 КК), «заклікі да санкцый» (ч. 3 арт. 361 КК) і «здраду дзяржаве» (арт. 356 КК).

У васьмі выпадках для крымінальнага пераследу выкарыстоўваліся дыфамацыйныя артыкулы – «абраза Аляксандра Лукашэнкі» і «абраза прадстаўнікоў улады».

35 СМІ прызнаныя экстрэмісцкімі фармаваннямі.

3 студзеня 2024 года стала вядома аб пазбаўленні БАЖ даменнага імя і пошты ў сувязі з «выяўленымі парушэннямі». Міністр інфармацыі падпісаў указ аб блакіроўцы доступу карыстальнікаў з Беларусі да рэгіянальнага інфармацыйнага інтэрнэт-выдання «Мой Брэст», які быў створаны больш за дзесяць гадоў таму і распавядаў галоўным чынам пра навіны, падзеі і людзей, якія маюць дачыненне да Брэсту і яго ваколіц.

Магілёўскі абласны суд 31 ліпеня асудзіў журналістаў Алеся (Аляксандра) Сабалеўскага і Яўгена Глушкова да пазбаўлення волі тэрмінам на чатыры і тры гады адпаведна. Яны прызнаныя вінаватымі па арт. 361-1 Крымінальнага кодэкса (стварэнне экстрэмісцкага фармавання або ўдзел у ім).

Супрацоўнікі Следчага камітэта 19 чэрвеня правяліператрус па адрасе, дзе афіцыйна зарэгістраваны **Зміцер Панкавец**. Тым часам журналіст ужо некалькі гадоў жыве за межамі краіны.

26 верасня суд Пінска і Пінскага раёна прызнаў журналіста Яўгена Нікалаевіча вінаватым па ч. 1 арт. 342 (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх) Крымінальнага кодэкса. Яму прызначылі паўтара года пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. У 2020 годзе Яўген Нікалаевіч у якасці відэакарэспандэнта «Медыя-Палесся» асвятляў пратэсты ў Пінску супраць фальсіфікацыі вынікаў прэзідэнцкіх выбараў. Журналіст не прымаў непасрэднага ўдзелу ў пратэстах: ён вёў фота- і відэаздымку па рэдакцыйным заданні. 10 жніўня 2020 года пры выкананні службовых абавязкаў Нікалаевіч быў затрыманы і збіты.

У кастрычніку адвольна затрымалі журналіста Ігара Ільяша — мужа двойчы адвольна асуджанай за прафесійную дзейнасць палітвязня журналісткі Кацярыны Бахвалавай. Яго фатаграфію і «пакаяльнае» відэа апублікавалі праўладныя тэлеграм-каналы.

**Катаванні, жорсткае, бесчалавечнае, зневажальнае абыходжанне**

З 2020 года праваабаронцы «Вясны» задакументавалі сведчанні больш за 1 850 пацярпелых ад катаванняў і іншых відаў забароненага абыходжання. Па-ранейшаму груба і беспакарана, паўсюдна і сістэмна ў Беларусі парушаецца права не падвяргацца катаванням і іншым жорсткім, бесчалавечным або прыніжаючым годнасць відам абыходжання — пры затрыманні, адбыванні адміністрацыйнага арышту, утрыманні пад вартай, у месцах абмежавання або пазбаўлення волі.

Распаўсюджанымі формамі катаванняў, зафіксаванымі праваабаронцамі, з'яўляюцца: збіванне, удушэнне, прымус знаходзіцца ў фіксаваным становішчы цела працяглы час (стаянне на насках, з выцягнутымі рукамі, скручаныя і ненатуральныя позы), уздзеянне на органы пачуццяў (напрыклад, яркае штучнае асвятленне ноччу) электрашокера, сэксуалізаваны гвалт, змяшчэнне ў перапоўненую камеру, працяглае адзіночнае зняволенне ў штрафным ізалятары, інкамунікада і інш.

Такім чынам, катаванні і негуманнае абыходжанне з'яўляюцца сістэмнай практыкай і прымяняюцца як праваахоўнымі органамі пры ажыццяўленні затрымання і іншых працэсуальных дзеянняў, так і персаналам пенітэнцыярных установ у дачыненні да асоб, якія там знаходзяцца.

Яскравы прыклад жорсткага абыходжання пры затрыманні — затрыманне ў сакавіку 2024 года Віталя Чопіка, дастаўленага пасля ў бальніцу хуткай дапамогі са слядамі моцных збіванняў і жоўтым колерам твару (можа казаць аб пашкоджаннях печані).

У многіх выпадках жорсткае абыходжанне пры затрыманні ажыццяўляецца на паказ. Сюды адносяцца выпадкі, калі наўмысна жорсткае затрыманне праводзіцца пад відэазапіс праўладных медыяў. Напрыклад, у красавіку 2024 года было апублікавана відэа затрымання мужчыны за негатыўныя каментарыі ў інтэрнэце ў адрас сілавых структур: затрыманне ажыццяўлялася дзесяццю супрацоўнікамі праваахоўных органаў са зброяй.

Цягам 2024 года праваабарончы цэнтр «Вяснам» працягнуў фіксаваць публікуемыя ў праўладных медыя відэа, на якіх затрыманыя вымушаныя прызнаваць віну і прыносіць прабачэнні («пакаяльныя відэа«). У асноўным такія відэа з'яўляюцца з асобамі, затрыманымі супрацоўнікамі ГУБАЗіКу. У 2024 годзе «Вясна» зафіксавала 703 публікацыі падобнага кантэнту, у асноўным з затрыманымі па палітычна матываваных справах, і ўсяго з 2020 года – 2 224 публікацый. Перыядычна на ўдзельніках такіх ролікаў можна заўважыць сляды збіванняў: напрыклад, **Кірыл Гаўрылаў**, затрыманы 29 сакавіка 2024 года за фатаграфаванне ваенных аб'ектаў, на відэа паказаны з гематомай на левым воку. У некаторых выпадках затрыманыя на такіх відэа вымушаныя раскрываць асабістую інфармацыю, у тым ліку ідэнтычнасць ЛГБТК+, якая выкарыстоўваецца для іх дыскрэдытацыі. Так, на відэа, апублікаваным 18 красавіка 2024 года з затрыманым удзельнікам вулічных пратэстаў, яго вымусілі раскрыць сваю сэксуальную арыентацыю.

Паведамленні аб катаваннях і негуманным абыходжанні працягвалі паступаць адносна ва ўсіх відаў пенітэнцыярных установах.

Адным з яскравых прыкладаў жорсткага абыходжання з'яўляецца практыка змяшчэння зняволеных у металічную клетку ва ўнутраным двары жаночай папраўчай калоніі № 4 (Гомель).

Змяшчэнне ў штрафныя ізалятары, карцэры і памяшканні камернага тыпу працягваюць выкарыстоўвацца ў якасці формы ціску ў пенітэнцыярных установах. Пра гэта працягваюць сведчыць былыя палітвязні. Так, палітвязень распавёў пра 10 месяцаў у

ШІЗА і ПКТ у папраўчай калоніі № 2 (Бабруйск) у вільготнасці і холадзе; **Сяргей Моніч** распавёў пра ўмовы ўтрымання ў штрафным ізалятары ў следчай турме № 4 (Магілёў), **Віктар Панцялееў** апісаў умовы ўтрымання ў карцэры ў СІЗА № 7 (Брэст) – памяшканне памерам паўтара метра на паўтара метра, туалет у выглядзе нічым не абгароджанай дзіркі ў падлозе, адкідная нара, маленькі столік і маленькі зэдлік. Доўгі тэрмін ўтрымання ў штрафным ізалятары па існуючых правілах – без прагулак, без працы і змястоўных заняткаў, без кантактаў са знешнім светам; а па шматлікіх сведчаннях – у пастаянным холадзе і ў неналежных санітарных умовах, з'яўляецца жорсткім бесчалавечным абыходжаннем, якое дасягае ўзроўню катаванняў.

Працягваюць паступаць сведчанні аб дыскрымінацыйных адносінах і негуманных умовах утрымання ў ізалятарах часовага ўтрымання. З-за агульнага нізкага ўзроўню абсталяванасці і антысанітарыі, а таксама незабеспячэння затрыманых гігіенічнымі сродкамі, доступам да гарачай вады і якаснай ежы, а таксама належнай медыцынскай дапамогай – з негуманным зваротам сутыкаюцца затрыманыя незалежна ад наяўнасці палітычных матываў пераследу. Важна таксама адзначыць асаблівую ўразлівасць жанчын-затрыманых: персанал ізалятара часовага ўтрымання (ІЧУ) пераважна мужчынскі, у камерах вядзецца відэаназіранне, санітарныя ўстаноўкі ў камеры не ізаляваны і не забяспечваюць дастатковай прыватнасці, гігіенічныя сродкі затрыманым не прадастаўляюцца.

Неаказанне своечасовай і якаснай медыцынскай дапамогі таксама можна аднесці да жорсткага абыходжання. Напрыклад, з-за верагоднага несвоечасовага аказання медыцынскай дапамогі памёр ад пнеўманіі палітвязень **Вадзім Храсько**. Паведамлялася аб адмове турэмнай адміністрацыі аказваць медыцынскую дапамогу **Марыі Калеснікавай**.

**Права на жыццё. Праблема смяротнага пакарання**

Беларусь — адзіная дзяржава ў Еўропе і Цэнтральнай Азіі, якая захоўвае і прымяняе на практыцы смяротнае пакаранне.

У 2023 годзе ў Беларусі прыгаварылі да смяротнага пакарання **Аляксандра Таратуту**: ён быў прызнаны вінаватым у наўмысным забойстве з абцяжарваючымі віну абставінамі. 9 студзеня 2024 года Вярхоўны суд пакінуў прысуд без змен. А. Таратута чакае выканання прысуду.

Камітэт па правах чалавека ААН апублікаваў рашэнне па індывідуальным звароце ад імя **Сямёна Беражнага** і **Ігара Гершанкова**, асуджаных да смяротнага пакарання і пакараных уладамі Беларусі ў 2018 годзе. Сярод парушэнняў Камітэт убачыў парушэнне права на справядлівае судовае разбіральніцтва, адзначыў, што ніхто не можа быць адвольна пазбаўлены жыцця, і запатрабаваў ад уладаў Беларусі выплаціць маці пакараных адпаведную кампенсацыю.

Па абвінавачанні ва ўчыненні тэрарыстычнага акта і іншых злачынстваў «экстрэмісцкага» характару Мінскі абласны суд 24 чэрвеня вынес смяротны прысуд у дачыненні да грамадзяніна Германіі ФРГ Рыка Крыгера. Гэта першы ў Беларусі прысуд

да выключнай меры пакарання за дзеянні, якія не прывялі да чалавечых ахвяр. Крыгер — адзіны чалавек у Беларусі, якога асудзілі да расстрэлу ў 2024 годзе, і першы замежнік за час існавання кампаніі «Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання ў Беларусі«, то-бок з 2009 года. Рыка Крыгера затрымалі ў кастрычніку 2023 года, аднак пра справу стала вядома толькі ў траўні мінулага года. Першае судовае паседжанне адбылося 6 чэрвеня, справа разглядалася менш за месяц.

Крыгера абвінавацілі па шасці крымінальных артыкулах: ч. 1 арт. 13 ст. 133 КК (падрыхтоўка да наёмніцтва); ч. 3 арт. 289 КК (акт тэрарызму); ч. 4 арт. 295 КК (незаконныя дзеянні ў адносінах да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў); ч. 4 арт. 309 КК (прывядзенне ў непрыдатнасць транспарту або шляхоў зносін); ч. 3 арт. 361-1 КК (удзел у экстрэмісцкім фармаванні); ст. 358-1 КК (агентурная дзейнасць). З усіх абвінавачанняў толькі «акт тэрарызму» прадугледжвае пакаранне ў выглядзе смяротнага пакарання. Прысуд у апеляцыйным парадку не разглядаўся.

Рыка Крыгер 30 ліпеня напісаў прашэнне аб памілаванні. Лукашэнка сабраў нараду з «людзьмі, якія непасрэдна маюць дачыненне да разгляду гэтай справы», і ўжо ўвечары таго ж дня прыняў рашэнне аб памілаванні.

1 жніўня Рыка Крыгер вызвалены ў рамках абмену зняволенымі, які прайшоў паміж ЗША, Расіяй, ФРГ і Беларуссю.

Ёсць шматлікія прыкметы таго, што Рыка Крыгер стаў ахвярай правакацыі беларускіх спецслужбаў; шэраг інкрымінаваных яму злачынстваў фактычна не ўчынены. Кваліфікацыя дзеянняў як тэрарыстычнага акта была адвольнай, прызванай даць падставу для адвольнага асуджэння да смяротнага пакарання ў адсутнасць чалавечых ахвяр — гэта, у сваю чаргу, стала магчымым пасля ўнясення адпаведных зменаў у Крымінальны кодэкс у 2022 годзе. Такія змены, накіраваныя на пашырэнне сферы прымянення смяротнага пакарання, наўпрост супярэчаць абавязкам Беларусі па Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах.